ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дарновым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок покп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Ды шматразовым друкаваньні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбаўкі.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

ПЯТНІЦА, 14 лістапада 1930 г.

№ 265 (3263)

Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Москва, Б-кое ЛСНХ СССР Экз. Стуж. Сект

БОЛЬШ КЛЯСАВАЙ ПІЛЬНАСЬЦІ

Контр-рэвалюцыянэраў, шкоднікаў—да вышэйшай меры пакараньня—

вось патрабаваньне пралетараў БССР

У АДКАЗ НА ПАГРОЗУ НОВАЙ ІНТЭРВЭНЦЫІ, У АДКАЗ НА ШКОДНІЦТВА ПРАЦОЎНЫЯ БССР УЗМОЦНЯЦЬ БАРАЦЬБУ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПЯЦІГОДКІ ЗА 4 ГАДЫ, ЗА ЯШЧЭ БОЛЬШУЮ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦЬ САВЕЦКАГА САЮЗУ

Раздавім

контр-рэвалюцыйных гадаў.

«Ня бывала яшчэ ў гісторыі такіх выпадкаў, каб паміраючая буржуазія не папрабавала ўсіх рэштак сваіх сіл для таго, каб адстаяць сваё існаваньне... Наша прасоўваньне наперад, наша наступленьне будзе скарачаць капіталістычныя элемэнты і выцясьняць іх, а яны, паміраючыя клясы, будуць супраціўляцца, ня гледзячы ні на што»... так аказьсьліваў тав. Сталін сутнасьць сучаснага пэрыяду абвостранага клясавага змаганьня. «На нашай рэвалюцыі,—пісаў Ленін,—больш чым на ўсякай іншай пацьвердзіўся закон, што сіла рэвалюцыі, сіла націску, энэргія, рашучасьць і ўрачыстасьць яе перамогі ўзмацняюць разам з тым сілу супраціўленьня з боку буржуазіі»...

Перамагаючы вялізарнейшыя труднасьці росту, наша неабсяжная савецкая краіна мацнее, усё шырэй і шырэй разгортвае сацыялістычнае будаўніцтва, штурмуе апошні аплот капіталістычнай эксплёатацыі — кулацтва, ліквідуючы яго, як клясу, на аснове суцэльнай калектывізацыі, вядзе па ўсім фронце рашучае сацыялістычнае наступленьне. Нават нашы заклятыя ворагі ня могуць адмаўляць фактаў росту Савецкага Саюзу, ня могуць адмаўляць таго, што пяцігодовы плян вялікіх работ ператвараецца «в плоть и кровь» новага сацыялістычнага грамадзтва. Але іменна гэты наш рост, гэта сіла нашага націску, рашучасьці і энэргіі выклікае шалёнае супраціўленьне паміраючых клясаў унутры краіны пры актыўнай дапамозе з боку ўсяе міжнароднае буржуазіі.

Разьбітыя ў першыя годы грамадзянскай вайны, міжнародныя інтэрвэнты і расійская контр-рэвалюцыя, ні ў якім разе ня спынілі барацьбы супроць савецкай краіны і падрыхтоўкі новай вайны супроць цытадэлі пралетарскай рэвалюцыі. Год за годам капіталісты ўсіх дзяржаў і перш за ўсё — францускі імпэрыялізм, разгортвалі ліхаманкавую падрыхтоўку да новай, больш арганізаванай інтэрвэнцыі. Чым мацней станавіўся Савецкі Саюз, чым больш рашуча мы разгортвалі наша наступленьне на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі і адначасова чым больш абвостраным станавіўся ўнутраны крызіс сусьветнага капіталізму і мацней узьнімалася хваля рэвалюцыйнага руху пралетарыяту і прыгнечаных народаў калёніі — тым больш жорстка рыхтаваліся імпэрыялістыя да ўзброенай барацьбы супроць савецкай улады. «Крыжовы паход», бязупынныя кампаніі супроць краіны пралетарскай дыктатуры, накшталт «куцепаўшчыны», а ў апошні час у сувязі з так званым «савецкім дэмпінгам», забойствы нашых прадстаўнікоў за мяжой і г. д., і г. д.—усё гэта былі і ёсьць этапы на шляху падрыхтоўкі крывавай бойні супроць СССР.

У гэтай грандыёзнай барацьбе ўсяго капіталістычнага сьвету супроць Савецкага саюзу, міжнародны імпэрыялізм і, у першую чаргу, — падпальшчык і арганізатар антысавецкай вайны — францускі капітал і яго польскія лёкаі, разам з белагвардзейскай эміграншчынай, шукалі апоры і знаходзілі яе ў капіталістычных элемэнтаў нашае краіны, у тэй буржуазнай тэхнічнай інтэлігенцыі, якая была тысячамі нітак зьвязана з расійскім капіталам і заняла адразу-ж варожыя пазыцыі ў адносінах да Кастрычніка.

Выкрытая нядаўна «прамысловая партыя», якая яднала ў сабе шкоднікаў-шпіёнскія элемэнты буржуазна-інжынэрскіх пластоў, знаходзілася цалкам на службе замежнага капіталу і была яго аплотам у справе падрыхтоўкі знутры ўзброенай інтэрвэнцыі супроць нашай краіны. Уся дзейнасьць шкодніцкіх груп і арганізацый, іх сувязь з чужаземнымі дзяржавамі, іх сувязь з уцёкшымі і недабітымі рэшткамі расійскай буржуазіі «прымусіла савецкую ўладу расцэньваць шкоднікаў не як выпадковую контр-рэвалюцыйную групоўку інжынэраў, а перш за ўсё, як пэўны мэтад клясавага змаганьня з боку буржуазіі, ЯК КЛЯСЫ У ЦЭЛЫМ, якая арганізавана дзейнічала ва ўсіх галінах нашага гаспадарчага будаўніцтва» (з абвінавачэньня заключэньня). Так неабходна ацэньваць клясавую сутнасьць усёй шкодніцкай работы, такі клясавы сэнс і тэй контр-рэвалюцыйнай работы, якую на працягу раду год вяла «прампартыя». Барацьба буржуазіі, як клясы ў цэлым, супроць сацыялістычнага будаўніцтва, барацьба расійскай і міжнароднай контр-рэвалюцыі супроць пралетарскай дыктатуры, імкненьне затапіць у крыві першую краіну рабочай улады — такавы клясавы зьмест барацьбы, якую вяла «прампартыя» пад кіраўніцтвам замежных капіталістых і белагвардзейцаў.

Выкрытая «прампартыя» была кіруючым асяродкам у адносінах да ўсіх контр-рэвалюцыйных, шкодніцкіх арганізацый і груп, якія існавалі ў нашай краіне. Гэта партыя, паставіўшая мэтаю зьвяржэньне пралетарскай дыктатуры, стала простай ваенна-шпіёнскай агентурай францускага імпэрыялізму. Пад кіраўніцтвам францускага генштабу, пад кіраўніцтвам крывавага Пуанкарэ і «спэцаў» ад антысавецкай вайны Жанэна, Лукомскага і інш., шкоднікі і шпіёны ў шчыльнай сувязі з парыскай арганізацыяй расійскіх белагвардзейцаў («Торгпром») ставілі задачай зрыў усяго нашага будаўніцтва і ўпарта гэту задачуажыцьцяўлялі.

Яны былі за аднаўленьне ўлады капіталу, ЗА ЗВАРОТ УСІХ ФАБРЫК, ЗАВОДАЎ І МАЁНТКАЎ ІХ БЫЛЫМ УЛАСЬНІКАМ, яны падрыхтоўвалі зрыў нашай пяцігодкі, па парадах Рабушынскага яны зьвагулькала, таксама як і ў 1917 годзе, рыхтаваліся «кастлявай рукой голаду» і ўсвагульнага крызісу задушыць працоўных Савецкага Саюзу і падрыхтаваць спрыяючую глебу для новай крывавай разьні, «Прампартыя», ставячы мэтай зьнішчэньне савецкай улады, высоўвала ўжо будучых фашысцкіх дыктатараў капіталістычнай Расіі ў зьезде вядомых катаў рабочае клясы і сялянства — Дзянікіна, Пальчыкоўскага, Лукомскага. Гэтыя вешацелі і жандары павінны былі кіраваць крывавай расправай над МІЛЬЁНАМІ рабочых і сялян і іх авангардам — камуністычнай партыяй.

Галоўным сродкам для ажыцьцяўленьня іх злачынна-крывавых мэт была інтэрвэнцыя. Яны не спадзяваліся знайсьці унутры краіны падтрыманьне. Яны імкнуліся рукамі замежных імпэрыялістых, сілай новых экспэдыцыйных карпусоў, падрыхтаваных за грошы Дэтэрдынгаў, Рабушынскіх, Нобеляў і францускага і ангельскага генштабаў, задушыць савецкую ўладу.

Абвінаваўчае заключэньне разгортвае яскравы малюнак таго, як рыхтавалася гэта новая інтэрвэнцыя, як зусім ушчыльную падышлі капіталістыя і іх унутраная апора — контр-рэвалюцыйныя шкоднікі і шпіёны, да практычнага варышэньня задачы арганізацыі новай антысавецкай вайны. Ужо ў 1930 г., на лета рыхтавалі яны пачатак новай вайны. Абавостраньне супярэчнасьцяй унутры капіталістычнага лягеру, магутны рост новай рэвалюцыйнай хвалі на Захадзе, рост магутнасьці Савецкага Саюзу і сувязі кампартый з шырокімі шматмільённымі масамі працоўных пакрыжавалі гэтыя плякы пачатку вайны ў 1930 годзе. Але вораг не адмовіўся ад вайны. Паказаньні саміх шкоднікаў і шпіёнаў гавораць аб тым, што гэтыя пляны толькі адсунуты на бліжэйшы час.

«Прампартыя» працавала непасрэдна пад кіраўніцтвам францускага генштабу і «Торгпрому». Францыя выступае, як вядучая сіла ў падрыхтоўцы антысавецкай інтэрвэнцыі. Разам з тым, факты і дакуманты выкрытай арганізацыі гавораць і аб тэй ролі, якую ў падрыхтоўцы гэтай інтэрвэнцыі адыгрывала і адыгрывае фашысцкая Польшча. Па плянах францускіх імпэрыялістых, Польшча і Румынія павінны былі першымі выступіць супроць Савецкага Саюзу, першымі справакаваць яго на вайну. Шкоднікі былі зьвязаны і з польскімі фашыстымі. У відзе «падарунка» польскаму імпэрыялізму кіраўнікі «прампартыі» ўжо загадзя аддавалі ім землі Савецкай Украіны і Беларусі. Такім чынам, расійская і міжнародная контр-рэвалюцыя ў сваёй барацьбе супроць пралетарскай дыктатуры несла ўсім нацыянальным рэспублікам—зьнішчэньне савецкай улады, аднаўленьне сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечаньня, ператварэньне іх зноў у калёніі расійскага, польскага, францускага, ангельскага імпэрыялізмаў. Вялікадзяржаўная расійская контр-рэвалюцыя ішла пад сьцягамі адзінай і недзялімай Расіі, адначасова распрадаючы паасобныя часткі Савецкага Саюзу (Украіну, Беларусь, Каўказ) францускім, ангельскім і польскім імпэрыялістым.

Зусім відавочна, што ў барацьбе супроць пралетарскай дыктатуры контр-рэвалюцыйная шкодніцкая арганізацыя, працаваўшая за грошы францускага імпэрыялізму, знаходзіла поўнае палітычнае падтрыманьне і з боку нацыянал-дэмакратычнай контр-рэвалюцыі. Мы ведаем з гісторыі грамадзянскай вайны, як усялякія Некрашэвічы і ім падобныя выенчвалі ў францускіх акупантаў і расійскага генэрала Дзянікіна дапамогу для барацьбы супроць савецкай улады на Беларусі. Зараз таксама, як і ў тыя гады, беларуская контр-рэвалюцыя ў адных радох з Лукомскімі, Дзянікінымі, Рамзінымі, пад камандай францускага і польскага генэральных штабаў, імкнулася да ажыцьцяўленьня плянаў інтэрвэнцыі.

Матар'ялы «прампартыі», апублікаваныя ў нашай прэсе, З УСЁЙ СІЛАЙ ПАДКРЭСЬЛІВАЮЦЬ УСЮ ВЯЛІЗАРНУЮ НЕБЯСЬПЕКУ НОВАЙ АНТЫСАВЕЦКАЙ ВАЙНЫ. Кожны працоўны СССР, працоўныя ўсяго сьвету, працоўныя Польшчы і Зах. Беларусі павінны ведаць, якая вялікая небясьпека пагражае справе рэвалюцыі з боку міжнароднага імпэрыялізму і яго саюзьнікаў — капіталістычных элемэнтаў нашае краіны. Барацьба далёка яшчэ ня скончана. Вораг усё яшчэ адвострывае зброю новай вайны, вораг вядзе шалёную барацьбу супроць нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Быць заўсёды гатовымі — вось наш баявы лёзунг, вось наш адказ інтэрвэнтам і «прампартыі».

Невыпадкова, погляды шкоднікаў і правадыроў «прампартыі» супадалі з поглядамі правых апартуністых і новага права-«лявацкага» блёку. Невыпадкова цэлы рад праваапартуністычнай групы аказаўся ў палоне контр-рэвалюцыйных шкоднікаў. На прыкладзе «прампартыі» з усёй яркасьцю выступаюць як правыя, так і «левыя» элемэнты ў сваёй барацьбе супроць генэральнай лініі партыі і становяцца зброяй у руках адкрытай контр-рэвалюцыі. Рамзін — праведыр «прампартыі» невыпадкова адрасуе свае палітычныя кампліманты па адрасе ідэалёгаў правай апазыцыі. Усякі, хто адступае ад партыйнай лініі, усякі, хто вядзе двурушніцкае змаганьне супроць партыі, усякі, хто прабуе інтрыгаваць з партыяй, кямінуча сьцірае паміж сабою і клясавым ворагам усякія межы, усякія дзяленьні. Самая вострая барацьба супроць правых апартуністых, супроць права-«левага» блёку азначае барацьбу супроць клясавага ворага, супроць яго агентуры ў нашай партыі.

Контр - рэвалюцыйная арганізацыя выкрыта. ПРАЦОЎНЫЯ МАСЫ БССР ГОРАЧА ВІТАЮЦЬ ВАРТАЎНІКА ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЫКТАТУРЫ — АДПУ. Працоўныя БССР патрабуюць бязьлітасных расправы са шкоднікамі, з шпіёнамі і здрадзінкамі. Суровая рука пралетарскай дыктатуры без усякай літасьці ўдарыць па клясавым ворагу, па тых, хто рыхтаваў узброеную інтэрвэнцыю.

У адказ на контр-рэвалюцыйнае шкодніцтва і падрыхтоўку вайны — працоўныя масы БССР адкажуць новай хваляй творчага энтузіязму, новым уздымам рашучасьці, энэргіі і націску ў ажыцьцяўленьні задач сацыялістычнага будаўніцтва, павышэньнем бальшавіцкіх тэмпаў работы. Працоўныя шчыльней згуртуюць свае рады вакол кампартыі, разгортваючы і надалей на ўсім фронце сацыялістычнае наступленьне і выконваючы пяцігодку за чатыры гады.

Працоўныя БССР, знаходзячыся на самай мяжы з капіталістычным сьветам, будуць яшчэ больш узмацняць абароназдольнасьць краіны, ваенную і палітычную магутнасьць нашай гэрэічнай і слаўнай Чырвонай арміі, каб быць заўсёды гатовымі для ўзброенай абароны Савецкага Саюзу, абароны вялікіх заваёў Кастрычніка.

У адказ на шкодніцкія акты—створаны ўдарныя брыгады

На буйнейшых маскоўскіх прадпрыемствах адбыліся шматлюдныя мітынгі пратэсту, на якіх рабочыя ганьбянь шкоднікаў-шпіёнаў з «прамысловай партыі» і патрабуюць суровага пакараньня. Так, рабочыя, служачыя, інжынэрна-тэхнічны пэрсанал Тормазнага ўдарна-камуністычнага заводу ў сваёй рэзалюцыі заяўляюць, што «біты надзеі контр-рэвалюцыянэраў на ўнутранае перараджэньне партыі і савецкай улады. Будуць біты і спробы інтэрвэнтаў ажыцьцёвіць узброены напад на Савецкі Саюз». Рабочыя ганьбуюць права-«лявацкі» блёк, які аб'ектыўна дапамагае клясаваму ворагу.

Рабочыя Тормазнага заводу абяцаюць узмацняць эканамічную і ваенную магутнасьць Савецкага Саюзу.

У адказ на шкодніцкія акты створаны 4 ударныя брыгады.

Рабочыя, служачыя і інжынэрна-тэхнічны пэрсанал Тормазнага заводу дамагаюцца ўжыць да шкоднікаў вышэйшую меру сацыяльнай абароны.

Рабочыя хадайнічаюць перад урадам аб узнагародзе АДПУ ордэнам Чырвонага Сьцягу.

* * *

Рабочыя вагона-рамонтнага заводу «Свара» (Сакольніцкі раён) патрабуюць ад Вярхоўнага суда рэспублікі бязьлітасных расправы над шкоднікамі. Гадзіна павінна быць раздушана!

Яшчэ большае напружаньне сіл на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады—вось адказ сварзаўцаў на ўсе спробы ворагаў сарваць сацыялістычнае будаўніцтва ў краі.

— Згуртуем свае рады вакол ленінскай партыі і яе ленінскага ЦК, які стойка змагаецца з усімі апартуністычнымі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, за ленінскае выкананьне пастаноў XVI зьезду УсеКП(б).

Сварзаўцы дамагаюцца ад ураду ўзнагароды АДПУ ордэнам Леніна.

Адказваюць ворагам рабочае клясы

У адказ на шкодніцтва, работніцы загатоўчага цэху электразаводу ў Маскве падпісаліся дадаткова на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» — ЦАРОВА — на 30 руб., ПАЛЯКОВА — 15 руб., ЦЕЛЮШКІНА — 50 руб., ГАЙДУКОВА — 50 руб., РАМОДЗІ — 50 руб.

Маскоўскі служачы чыгункі (рахункавод) т. НОВАКРАШЧНАЎ, у адказ на шкодніцтва «прамысловай партыі», ПЕРАДАЎ У РАСПАРАДЖЭНЬНЕ ЦК УсеКП(б) 300 РУБ. НА АБАРОНУ КРАІНЫ.

ЛЕНІНГРАД. Рабочыя, работніцы і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал заводу «Красный Путиловец» з вялікім абурэньнем ганьбяць контр-рэвалюцыйных шкоднікаў з «прамысловай партыі» і яшчэ раз адзначаюць подлую здрадніцкую дзейнасьць кучкі буржуазных спэцыялістых, якім рабочая клясa даверыла адказнейшую работу на важнейшых участках сацыялістычнага будаўніцтва.

Вынікі сьледзтва па справе «прамысловай партыі» поўнасьцю асьвятляюць антысавецкую дзейнасьць францускага імпэрыялізму, а таксама ўрадаў і генэральных штабаў буйнейшых капіталістычных дзяржаў і выразна выкрываюць сапраўдную падаплёку раду антысавецкіх кампаній апошняга часу.

У адказ на шкодніцтва 27.000 рабочых «Красного Путиловца» заяўляюць, што ўпартасьць працоўных СССР у вялікай барацьбе за сацыялізм непахісна.

— Мы зьмяцем, — гаворыцца далей у рэзалюцыі, — з свайго шляху ўсіх, хто прабуе затармазіць пераможнае шэсьце сталёвых батальёнаў пралетарыяту.

Мы патрабуем расстрэлу шкоднікаў і запэўняем урад, што яшчэ больш узмоцнім нашу пільнасьць і наіпруем усе сілы на ўмацаваньне абароны краю, паўдарнаму выкананьню усе гаспадарча-палітычныя заданьні ўдарнага кварталу і рашаючага году пяцігодкі.

Вучоным шкоднікам—расстрэл

Адкрыты сход рабочых шкпозагатоўчага і вакуўмнага цэхаў Электразаводу патрабуе бязьлітаснай расправы над здрадзінкамі і шкоднікамі — з «прамысловай партыі». Адзіная мера, якую можна ўжыць да вучоных шкоднікаў — расстрэл.

У адказ на шкодніцтва і на аб'яднаньне ўсіх апартуністычных элемэнтаў, рабочыя Электразаводу абяцаюць усе свае сілы накіраваць на сацыялістычную перабудову краю. Рабочыя заяўляюць, што павышаную праграму сваіх цэхаў пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, яны выкананць поўнасьцю.

На шкодніцтва адказваюць стварэньнем ударных брыгад

Агульны сход супрацоўнікаў ВСНГБ супольна са спэцыялістымі патрабуе ад Вярхоўнага суда вышэйшай меры пакараньня для ўсіх шкоднікаў «прамысловай партыі».

У адказ на шкодніцтва супрацоўнікі і спэцыялісты абвяшчаюць сябе мабілізаванымі на дапамогу прадпрыемствам па ліквідацыі прарываў і мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

У Гомелі адзін брыгада на чале з тав. Грысевічам і Фішам, у Віцебск — брыгада на чале з тав. Васкабойнікавым, а ў Менску — на чале з тав. Стракоўскім і Дварэцкім.

ПАТРАБУЕМ РАССТРЭЛУ АГЕНТАЎ СУСЬВЕТНАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ

Абвінаваўчае заключэньне па справе контр-рэвалюцыйнай арганізацыі «прамысловая партыя» ўскалыхнула шырокія рабочыя масы г. Менску. Пралетарская грамадзкасьць з абурэньнем адзначае спробы контр-рэвалюцыйнага шкодніцтва спыніць пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва.

На буйнейшых менскіх прадпрыемствах адбыліся шматлікія лятучыя мітынгі пратэсту. Мітынгі прайшлі з вялікім уздымам.

Так, агульны сход рабочых, служачых, інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу заводу «Камунар» ва ўхваленай рэзалюцыі канстатуе:

1. Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва і ліквідацыя апошняга аплоту капіталізму ў нашай краіне—кулацтва, на базе суцэльнай калектывізацыі, ня могуць ня выклікаць жорсткага супраціўленьня ўсіх варожых нам клясавых сіл. Шматлікія акты шкодніцтва, выкрытыя стоўкім вартаўнік Кастрычніка —слаўным АДПУ на ўсіх галінах нашае прамысловасьці і сельскае гаспадаркі, паказваюць, што міжнародныя драпежнікі імкнуцца арганізаваць інтэрвэнцыю на Савецкі Саюз, апіраючыся на нашых унутраных клясавых ворагаў.

2. Мы патрабуем ад Вярхоўнага суда Савецкага Саюзу самага суровага пакараньня — расстрэлу гаентэў сусьветнага імпэрыялізму, падрыхтаўцеляй сацыялістычнага будаўніцтва і арганізатараў ваеннай інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу.

3. Мы ўпэўнены, што сарваць наша сацыялістычнае будаўніцтва сусьветнаму імпэрыялізму, нашым унутраным клясавым ворагам і іх агентам—правым і «левым» апартуністым—ня ўдасца, а ўспыхм спробам будзе даны яшчэ больш дружны, згуртаваны адпор.

Пад бальшавіцкім кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, яшчэ шчыльней згуртуемся супроць шкоднікаў, апартуністых правага і «левага» балота, за маналітнасьць партыі, за выкананьне ўсіх гаспадарчых задач, за наступленьне на капіталістычныя элемэнты па ўсім фронце.

Няхай жыве слаўны вартавы сацыялістычнага будаўніцтва—АДПУ!

Няхай жыве кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва—Ленінская Кампартыя!

* * *

Рабочыя заводу «Энэргія» патрабуюць ад савецкага суда расстрэлу шкоднікаў, шпіёнаў з «прампартыі».

Завод «Энэргія», які перавыканаў прамфінплян другога году пяцігодкі з такой-жа настойлівасьцю будзе змагацца за выкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу і лепшую падрыхтоўку для трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Няхай жыве ленінская Камуністычная партыя бальшавікоў і яе правадыр тав. Сталін!

Няхай жыве верны вартаўнік пралетарскай дыктатуры—орган ДПУ!

* * *

Агульны сход рабочых, работніц і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу фабрык «Чырвоная Бярэзіна», «Пралетарская перамога» і электрастанцыі імя Леніна, заслухоўшы паведамленьне аб выкрыцьці контр-рэвалюцыйнай арганізацыі «прампартыі» патрабуюць ужыцьця да ўсіх удзельнікаў арганізацыі вышэйшай меры пакараньня. Сход адзначыў неабходнасьць узмацніць клясавую пільнасьць на вытворчасьці.

Агульныя сходы рабочых вітаюць гэрэічную работу АДПУ—вернага вартаўніка Кастрычніцкіх заваёў.

У адказ на контр-рэвалюцыйную работу шкоднікаў яшчэ больш згуртуемся вакол ленінскай партыі і яе бальшавіцкага ЦК на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Задачы раённых кантрольных камісій КП(б)Б

(Да пленуму ЦКК КП(б)Б)

Пастановы XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б ускладаюць на кантрольныя органы выключна важныя задачы.

Гэтыя задачы ў асноўным зводзяцца: першае і галоўнае—змаганьне за адзінства радоў партыі, забесьпячэньня выразнага правядзеньня генэральнай лініі партыі, бязьлітасная барацьба з правым і «левым» апартунізмам і прымірэнцтвам да іх. У задачы органаў КК-РСІ уваходзіць забесьпячэньне пасьпяховага выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, далейшае пашырэньне і замацаваньне сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы; правядзеньне ленінскай нацпалітыкі — рашучая барацьба з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, з контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі ўсіх колераў; шырокае разгортваньне самакрытыкі, унутры-партыйнай дэмакратыі і г. д.

У пастановах партыйных зьездаў даны зусім канкрэтныя паказаньні аб тым, што толькі «цуцгваючы новыя дзесяткі і сотні тысяч рабочых і сялян у рознастайныя формы кантролю і кіраваньня дзяржавай, ЦККК-РСІ павінна з яшчэ большай энэргіяй і пасьлядоўнасьцю выконваць ролю арганізатара пярэйшых мас, ажыцьцяўляючы дырэктыву Леніна аб тым, каб «усю працоўную масу і мужчын і жанчын асабліва правесьці праз удзел у рабоча-сялянскай інспэкцыі» (з пастановы XVI зьезду) — могуць і павінны ажыцьцяўляцца гэтыя задачы.

У выкананьні гэтых задач вялікую ролю павінны адыграць арганізаваныя пядаўна раённыя кантрольныя камісіі КП(б)Б.

Аднак, работы пленуму ЦКК КП(б)Б, які зараз адбываецца, паказвае, што на мясцох наглядаецца недаацэнка ролі і значэньня райКК-РСІ. На пленуме ЦКК прыводзілі прыклад, калі адзін з адказных работнікоў РВК па-спрашчэнцку ўяўляе сабе работу райКК-РСІ — «для прыёму скаргаў можна паставіць столік у адным з пакояў РВК і ўсё тут». Зразумела, што такое ўяўленьне ролі КК-РСІ абсалютна няправільнае і не вынікае з задач, што пастаўлены партыяй перад кантрольнымі органамі.

Найбольш вострым для райКК зьяўляецца пытаньне аб кадрах. Калі ў асноўным можна лічыць падабраным склад старшынь КК-РСІ, дык раённыя КК-РСІ не ўкамплектаваны другімі работнікамі (сакратарамі, інспэктарамі). Побач з актыўнай дапамогай раённых партыйных арганізацый, трэба паставіць перад комвузам імя Леніна задачу падрыхтоўкі поўных кадраў для кантрольных камісій.

Раённыя КК-РСІ за кароткі тэрмін сваёй дзейнасьці яшчэ ня здолелі стаць сапраўднымі арганізатарамі мас. Яны яшчэ не ўцягнулі ў сваю работу мас рабочых, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі. Ня ўсюды арганізаваны камісіі (сэкцыі) РСІ, якія павінны стаць асноўнымі дапаможнікамі райКК-РСІ. Не ўстаноўлена яшчэ сувязь в рэзівійнымі камісіямі саветаў і іншых арганізацый; не прыступлена да арганізацыі шэфства прадпрыемстваў (што знаходзяцца ў раёне) над савецкімі ўстановамі; не разгорнута, як сьлед, барацьба зь дзейнасьцю самакрытыкі, рэагаваньне на заметкі і работа з рабселькорамі.

РайКК, асабліва на сучасным этапе і фармаваньня, неабходна аказаць максымальную дапамогу і сэдзейнасьць ў іх рабоце. У гэтым парадку трэба бясспрэчна ўхваліць вопыт скліканьня нарад-курсаў работнікаў райКК-РСІ, якія былі нядаўна арганізаваны ЦКК - РСІ. Неабходна таксама падтрымаць думку выступаўшых на пленуме таварышоў аб устанаўленьні практыкі доўгатэрміновых выездаў членаў ЦКК і работнікаў цэнтральнага апарату для дапамогі райКК-РСІ.

Пленум ЦКК павінен прыняць неабходныя пастановы ў напрамку разгортваньня работы райКК-РСІ. Адначасова, мясцовыя партыйныя арганізацыі павінны прыняць рашучыя меры для ўмацаваньня кантрольных камісій лепшымі і адданымі кадрамі.

Трэба дабіцца, каб раённыя кантрольныя камісіі сталі сапраўды бальшымі органамі партыі ў раёне, якія стаяць на варце аховы адзінства партыі, на падставе правядзеньня генэральнай лініі партыі, каб яны сталі органамі, якія актыўна садзейнічаюць выкананьню пяцігодкі за чатыры гады.

Асабліва неабходна ўзьняць ролю райКК-РСІ ў справе кантролю за выкананьнем дырэктыў партыі і ўраду па саўгасным і калгасным будаўніцтве, па арганізацыі новага прыліву ў калгасах, ажыцьцяўленьні палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі.

РайКК-РСІ павінны актыўна садзейнічаць, шляхам арганізацыі масавага кантролю за правядзеньнем важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній — пасеўных, загатовак збожжа і бульбы, мабілізацыі ўнутраных сродкаў і г. д.

У барацьбе за пяцігодку, базумоўна, вялікае значэньне адыгрывае дзяржапарат. РайКК з дапамогай рабочых, батракоў, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі павінны разгарнуць работу на паляпшэньні, здаравленьні і змяншэньні дзяржапарату ад элемэнтаў, якія разлажыліся сацыяльна, і шкодніцкіх элемэнтаў і адначасова даць бязьлітасны адпор анты-партыйнаму праваа-«лявацкаму» паклёпу на савецкі апарат.

М. З.

УСІМ РАЙКОМАМ КП(б)Б

Катэгарычна прапануецца дасылаць у ЦК КП(б)Б статыстраведамасьць аб яку і складзе школ, курсаў і гурткоў палітграматы па форме № 6 і аб ліку і складзе дэлегацкіх сходаў скліканьня 1930-31 г. па ф. № 9.

Заг. Арг.-інстр. аддзелу ЦК КП(б)Б—ГАНТМАН.

Расправа польскага фашызму над беларускімі сялянамі

Масавыя арышты ў Холмшчыне

ВАРШАВА, 13. У Холмшчыне арыштаваны кандыдат сьпісу рабоча-сялянскага адзінства Пентала. Па ўсёй Холмшчыне адбываюцца масавыя арышты асоб, якія абвінавачваюцца ў прыналежнасьці да камуністычнае партыі Зах. Украіны. Аб масавых арыштах паведамляюць з Вёрхняй Сілезіі.

* * *

ВАРШАВА, 13. Акруговы суд у Горадні вынес прыгавар па справе былых дэпутатаў беларускага рабоча-сялянскага блёку «Змаганьне» — Дварчаніна і Валынца і 16 беларускіх сялян, якія абвінавачваюцца ў актыўным выступленьні супроць паліцыі на мітынгу ў Алексьцах. Дварчанін і Валынец прыгаворваны да 6 год катаржнай турмы кожны. Рэштка абвінавачаных прыгаворваны да турэмнага зьняволеньня на тэрмін ад аднаго году да 6 месяцаў.

Супроць т. Жарскага ўзбуджана новая судовая справа

ВАРШАВА, 13. Супроць камуністычнага дэпутата сойма Жарскага (прысуджанага пядаўна да 8 год катаржнай турмы) узбуджана новая справа аб зьневажаньні суда. Гэта зьневажаньне ўгледжана ў выступленьні Жарскага па яго апошнім працэсе ў Варшаўскім акруговым судзе. Жарскі назваў на гэтым працэсе суд фашысцкім і, выслухаўшы спакойна прыгавар да 8-мі год заключэньня, кінуў у твар суду: «Вы распараджаецеся, паны, не сваімі думкамі».

За абразу крывавага паліцэй-фашыстага Цэргібеля

БЭРЛІН, 13. На аснове закону аб абароне рэспублікі, пракуратура пачала сьледзтва на абвінавачаньні трох рэдактараў «Ротэ Фанэ» у абразе б. берлінскага паліцэй-прэзыдэнта сацыял-дэмакрата — Цэргібеля. Ва абразу таго-ж Цэргібеля і за абразу нямецкай рэспублікі, якая была названа «рэспублікай гразьвага мяшка», каб апублікаваны апошні нумар цэнтраяльнага органу нямецкага камсамолу, «Юнге Гардэ». Учора раніцаю агенты берлінскай палітычнай паліцыі арэбілі вобыск у друкарні і ў выдавецтве, дзе выдаюцца і друкуюцца «Ротэ Фанэ» і «Юнге Гардэ». (ТАСС).

45 ЗАМЕСТ 700

вагонаў бульбы адгружаецца штодзенна

Усе сілы на фарсаваньне адгрузкі бульбы

У першых радох

лепшыя раёны па адгрузцы бульбы

Паводле даных на 12 лістапада

1. Асіпавіцкі раён выканаў 121,2 проц. пляну адгрузкі;
2. Віцебскі раён—105 проц.
3. Дубровенскі р.—130 проц.
4. Ляднянскі—111 проц.;
5. Гомельскі—124 проц.

Перадавікі, вазьмеце на буксір тых, хто адстае

Віцебскі, Асіпавіцкі, Дубровенскі, Ляднянскі і Гомельскі раёны выканалі з посьпехам плян адгрузкі, дабіўшыся перавышэньня заданьня. Ваш просты абавязан — узяць на грамадзкі буксір суседнія адстаючыя раёны. За работу! Пераключайцеся на дапамогу адстаючым!

59,3 проц. заданьня

ПАВОДЛЕ ДАНЫХ НАРКАМТАДЛЮ ЗА 12 КАСТРЫЧНІКА, АДГРУЖАНА ЗА МЕЖЫ БССР 2.344 ТОНЫ БУЛЬБЫ. З НАЧАТКУ КАМПАНІІ АДГРУЖАНА 107.195 ТОН, ШТО СКЛАДАЕ 59,3 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.

НА АДРАС ЛСПО (ЛЕНІНГРАД) АДГРУЖАНА 71,2 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.

МАСКВЕ — 52,3 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.

ПАЎНОЧНА - ЗАХОДНЯМУ САЮЗУ (ЛЕНІНГРАДЗКАЯ ВОБЛАСЬЦЬ) — 108,1 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.

ДАНБАСУ І УКРАІНЕ — ТОЛЬКІ 30 ПРОЦ. НАРАДУ

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

РУЙНУЮЧЫ АДПОР ПРАВА-„ЛЯВАЦКАМУ" БЛЁКУ,

які імкнецца сарваць пераможнае сацыялістычнае наступленьне

ПАРТЫЙНЫЯ МАСЫ ПАТРАБУЮЦЬ РАШУЧА УЖЫЦЬ АДПАВЕДНЫЯ ПАСТАНОВЫ ПАРТЫЙНЫХ ЗЬЕЗДАЎ ДА ПРАВЫХ І „ЛЕВЫХ" ФРАКЦЫЯНЭРАЎ І ІХ ЛІДЭРАЎ

УсеКП(б), пад цьвёрдым ленінскім кіраўніцтвам свайго ЦК і правадыра партыі—тав. СТАЛІНА, перамагаючы ўсякія ўхілы ад ленінізму, будзе павышаць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва

КП(б)Б была і будзе верным атрадам УсеКП(б)

Актывізацыя правых і «левых» апартуністых, іх бяспрынцыпнае блёкаваньне ў змаганьні супроць генэральнай лініі партыі, супроць яе ленінскага кіраўніцтва зьявілася сыгналам для адкрытых выпазак правых капітулянтаў у радзе партыйных арганізацый, у тым ліку і ў КП(б)Б. Упартае маўчаньне на працягу ўсяго пасьлязьездаўскага пэрыяду лідэраў правага апартунізму і, нарэшце, выступленьне Рыкава на фабрыцы «Уцільсырэц», Бухарына — у парт'ячэйцы НДС — зьявіліся скрытай салідарызацыяй правых лідэраў з двурушніцкай і падрыўной дзейнасьцю правых і «левых» апартуністых і выклікалі да жыцьця кулацкую агентуру ў радзе партыйных арганізацый.

Найбольш выразнае праяўленьне актывізацыі правых апартуністых у КП(б)Б знайшло свой адбітак у выступленьні о адкрыта апартуністычнай прамовай **санратара Любаньскага РК партыі Нікіфарава** на пленуме ЦК КП(б)Б. Гэты апартуністы Нікіфараў у сваёй **трасное** зрабіў выпад супроць цэнтральных кіруючых органаў БССР, высунуўшы ні на чым неўтрунтаванае яўна паклёпніцкае абвінавачаньне плянаў, якія зацьвярджаюцца Цэнтральным Камітэтам КП(б)Б і Саўнаркомам. Кулацкі агент Нікіфараў заявіў: «галавацкіскія пляны, якія даюцца з цэнтру, робяць на мясцох контр-рэвалюцыю». Гэта мог сказаць толькі клясавы вораг, а член партыі і кіраўнік раённай арганізацыі толькі паўтарыў кулацкія наклепніцкія сьпевы на пляны ўраду БССР.

У чым-жа сутнасьць выступленьня Нікіфарава? У сваім выступленьні на пленуме ён заявіў: «Актыўнасьць бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі паніжаецца, а то і зусім адсутнічае. Установак у калектывізацыі брацьмі трэба. Таму ўстанаўленьне лімту — 20 проц. калектывізацыі—зьяўляецца палітычнай памылкай з боку Бюро ЦК... Усе пляны, якія дае партыя для вёскі, зьяўляюцца пераўлымі і перанавялічанымі. Яны выканаць быць ня могуць і выклікаюць контр-рэвалюцыю». Вось канцэпцыя праваапартуністычнай прамовы Нікіфарава.

Ці выпадкова гэта выступленьне? Не, невыпадкова. Гэта не памылковыя агаворкі, а цэлая канцэпцыя закончаных думак правага апартуністага, які абвінавачвае партыю ў тым, што яна ўзяла непасільныя тэмпы на індустрыялізацыю краіны і калектывізацыю сельскае гаспадаркі. Правы апартуністы Нікіфараў у плянах сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце бачыць непасільную нагрузку на селяніства і г. д. **Яшчэ на XIII зьезьдзе КП(б)Б гэты-ж самы Нікіфараў выступіў з абвінавачаньнем ЦК КП(б)Б за тое, што ЦК ёёў і мабілізаваў масы на бязьлітаснае змаганьне супроць правага ўхілу, «левых» загібаў і прымірэнцтва да ўхілаў ад лініі партыі.** Ужо тады з боку Нікіфарава былі праяўлены спробы проціпаставіць лініі партыі, разьлічанай на бязьлітаснае змаганьне супроць правага ўхілу,—лінію прымірэнцтва да ўхілаў ад лініі партыі. На даным пленуме ЦК КП(б)Б Нікіфараў даў ужо разгорнутую праграму правага апартунізму. Там, на зьезьдзе, ён быў ня згодзен з лініяй ЦК адносна змаганьня з правым апартунізмам і нацыянал-апартунізмам і іх канкрэтнымі посьбітамі, а тут Нікіфараў разгарнуў праграму махровага апартунізму. Гэта выразна пагазвае і давальне з цьвёрдай упэўненасьцю падкрэсьліць, што гэта выступленьне не агаворка і не выпадковае, а пасьлядоўнае разьвіцьцё поглядаў кулацкага агента.

Адным з матываў у дорадах Нікіфарава зьяўляецца тое, што нібыта пляны прадугледжваюць празьмернае павялічэньне пасеўнай плошчы. Нікіфараў, на ўласьцівай усім апартуністым сьлепаце, ня бачыць тых вялікіх магчымасьцяй, якія дазваляюць нам пашыраць пасеўную плошчу. У адным **Любаньскім** раёне, дзе працаваў Нікіфараў, вельмі шмат зусім невыкарыстанай, няўлягнутай у сельска-гаспадарчы зварот зямлі. У самай Любані ляжаць сотні і тысячы гэктараў найлепшага чорнаазему, які можа даваць паўтары сотні пудоў збожжа з гэктара. Варта толькі пракапаць там пёвялікую канаву, каб насьля гэтага праехаць па гэтым абшары з трактарам, узяць яго і паставіць на службу сацыялізму. Толькі апартуністы ня можа бачыць гэтых вялікіх магчымасьцяй. Гэтыя багатыя магчымасьці для пашырэньня пасеўнай плошчы ёсьць ня толькі ў Любаньскім раёне, а і ва ўсіх іншых. Трэба іх толькі скарыстаць, выдучы бязьлітаснае змаганьне супроць правых апартуністых у тэорыі і на практыцы, якія баяцца ўсякага новага пачынаньня, якія няздольны праяўляць і накіроўваць ініцыятыву на справу сацыялістычнага будаўніцтва.

Гэты факт выразна гаворыць аб тым, што канцэпцыя праваапартуністычных поглядаў, якую выказаў на пленуме Нікіфараў, ім ажыцьцяўлялася на практыцы ў Любаньскім раёне.

Пленум ЦК КП(б)Б даў рашучы адпор гэтай кылазцы, і сваёй спэцыяльнай пастановай кваліфікаваў гэтую прамову, як праваапартуністычную, якая цалкам накіравана супроць генэральнай лініі нашай партыі, якая паўтарае праграму правага ўхілу і ўзводзіць паклёп на партыю.

Партыя мабілізуе і ўздымае шырокія масы рабочых на разгорнутае сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Партыя зусім выразна заўуляе рабочым, калгаснікам і бядняцка-серадняцкім масам сяляньства, што мы ідзем да сацыялізму напружанымі тэмпамі, бо сацыялізм, як гаворыцца, у белых рукавічках не пабудуеш. На фабрыках, на заводах, у калгасах, сярод бядняцка-серадняцкіх мас адзінаасобнікаў мы наглядаем нябывалы рост ініцыятывы і актыўнасьці. Нікіфараў-жа выходзіць і заўуляе аб адсутнасьці актыўнасьці. Гэта хлусьлівае паклёпніцтва на рабочыя масы, на калгаснікаў, на шырокія масы працоўнага сяляньства. Сваю ўласную апартуністычную пасыўнасьць, бязьвіцынытыўнасьць правыя капітулянты прабуюць перанесьці на рабочую клясу, на працоўныя масы сяляньства.

У Любаньскім раёне больш 13 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак арганізаваліся ў калгасы пры паўнасьці апартуністычных самацёчных настроў кіраўніка партыйнай арганізацыі. Стара вёска, увесь стары яе быт, уся яе эканоміка ламаецца, перакульваецца дагары нагамі і становіцца на новыя сацыялістычныя падставы. Хіба гэта рэзультат пасыўнасьці працоўных мас сялянства? Не, гэта выразны факт таго, наколькі актыўнасьць бядняцка-серадняцкіх мас вёскі ўзрасла, наколькі шпаркімі тэмпамі яна ўзыходзіць на яшчэ больш высокую ступень. У пэрыяд, калі масы калгаснікаў і бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі выпрацоўваюць сутрэчныя пляны, калі адзінаасобнікі з вялікім уздымам дапамагаюць калгасам у правядзеньні сельскагаспадарчых кампаній, калі рабочая клясе прад'яўляе дзяржаве сустрэчныя прамфінпляны, калі чырвоныя абозы ідуць з кожнае вёскі са збожжам для здачы дзяржаве,—у гэты пэрыяд аб пасыўнасьці рабочае клясы і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі могуць гаварыць толькі правыя і «левыя» апартуністыя, толькі агентура варожае клясы і розныя капіталістычныя элементы.

Партыя ўсямерна разгортвае і падымае на вышэйшую ступень актыўнасьць рабочых мас і мас працоўнага сяляньства і накіроўвае яе па шляху сацыялістычнай перабудовы гораду і вёскі. І бязумоўна, калі па-апартуністычнаму злажыць рукі, сядзець і чакаць, пакуль бядняцка-серадняцкія масы прыдуць і пачнуць падштурхоўваць кіраўніцтва, дык можна прапасьць усё, што хочаце. Кулацтва гэта скарыстае, праявіць сваю клясавапаварожую актыўнасьць, пастарасьцца да гэтага выкарыстаць актыўнасьць бядняцка-серадняцкіх мас і навяраваць яе супроць палітыкі партыі, у сваю карысьць, на справу рэстаўрацыі капіталізму. Гэта павінен добра памятаць кожны. Стаўка на самацёк—выразьнейшае праяўленьне апартунізму. Таму трэба самым бязьлітасным парадкам выкараняць настроі і стаўкі на самацёк, трэба бязьлітасна біць на ўсякіх падзелах на тое, што масы самі прыдуць і падштурхнуць да работы, трэба біць па ўсякіх імкненьнях прыдушыць актыўнасьць бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

Партыя бязьлітасна біла і будзе біць па правых і «левых» апартуністых, якія стараюць бяспрынцыпны блёк у змаганьні супроць генэральнай лініі партыі, супроць яе ленінскага кіраўніцтва —ЦК УсеКП(б). **КП(б)Б заўсёды была і будзе верным атрадам УсеКП(б) у змаганьні за ленінізм, за чыстату ленінскай лініі ў тэорыі і ў практычнай рабоце на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.** КП(б)Б давала і дасьць адпор усялякім ухілам ад ленінскае лініі партыі, як праваму, так і «леваму» апартунізму і іх права-«лявацкаму» блёку тыпу Сырцова, Ламінадзэ, Шацкіна і інш., давала і дасьць бязьлітасны адпор нацыянал-апартунізму, які зьяўляецца дапаможнікам беларускага контр-рэвалюцыйнага нацыянал - дэмакратызму, узмацняючы змаганьне супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, і шавінізмам усіх колераў.

КП(б)Б будзе зьмінаць з кіруючых пастоў, будзе беспаваротна выганяць са сваіх радоў кулацкую агентуру, двурушнікаў і здрадніка́ў партыі, будзе беспаваротна выганяць усіх тых, хто на карысьць варожым клясам імкнецца падарваць справу сацыялістычнага будаўніцтва і справу сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і ажыцьцяўленьня лёзунгу партыі—ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнае калектывізацыі.

М. ГАЛАДЗЕД.

Агонь па права-„лявацкіх" фракцыянэрах

У змаганьні за бальшавіцкую непахіснасьць партыйных радоў КП(б)Б яшчэ шчыльней згуртуецца вакол ленінскага ЦК УсеКП(б)

З рэзалюцыі Бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б ад 10-XI 1930 г.

1. Пасьпяховае разгорнутае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце ўзмацняе супраціўленьне аджываючых клясаў і выклікае абвастраньне клясавай барацьбы. Гэта знаходзіць свой адбітак і ў радох партыі. Барацьба права-ўхілістых, якія зьяўляюцца кулацкай агентурай у радох партыі, супроць генэральнай лініі партыі, супроць выпрабаванага ленінскага кіраўніцтва ЦК УсеКП(б) выяўляе супраціўленьне капіталістычных элемэнтаў краіны ўзмоцненаму наступленьню сацыялізму. Гэта барацьба аб'ектыўна зьяўляецца працягам дзейнасьці контр-рэвалюцыйных арганізацый на чале з Кандрацьцевым, Громана, Сухановым, Рамзіным і інш., якія ставілі сваёй мэтаю зьвяржэньне дыктатуры пралетарыяту ў саюзе з права-ухілістымі.

2. Рад права-апартуністычных вылазак і фактаў двурушніцкай работы апошняга часу прывёў да выкрыцьця анты-партыйнай фракцыйнай работы **Сырцова, Ламінадзэ, Шацкіна** і інш. Цеснае перапляценьне адкрытых права-апартуністычных установак з «лявацкімі» трацкісцкімі, узьведзеная ў сыстэму канспірацыйная фракцыйная работа ў радох партыі, двурушніцтва, ашуканства і здрадніцтва зьяўляюцца найбольш характэрнымі рысамі гэтага новага выступленьня правага апартунізму супроць ленінскага кіраўніцтва ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным.

3. Нецярпіма, антыпартыйная, фракцыйная работа Сырцова, Ламінадзэ, Шацкіна і інш. аб'ектыўна падрыхтавала барацьбой супроць партыі правых апартуністых, на чале з **Бухарыным, Рыкавым і Томскім.** Упартае маўчаньне гэтых т. т. перад тварам раду фактаў двурушніцкай і фракцыйнай работы ў радох партыі сьведчыць аб іх сьвядомым імкненьні стаць прыцягваючым цэнрам для ўсіх сіл, якія змагаюцца супроць генэральнай лініі партыі.

4. Бюро ЦК КП(б)Б сумесна з прэзыдыумам ЦКК КП(б)Б лічыць, што пастанова XVI зьезду аб несумяшчальнасьці поглядаў правага апартунізму са знаходжаньнем у радох партыі, павінна быць дастасавана ў адносінах да ўсіх правых апартуністых, якія працягваюць барацьбу супроць партыі тым ці іншым шляхам,—адмоўчваньня, двурушніцтва, фракцыйнай барацьбы і г. д.

У барацьбе за генэральную лінію партыі, за ачышчэньне радоў партыі ад права-апартуністычных элемэнтаў, якія прадстаўляюць сабою галоўную небясьпеку на даным этапе, і ад рэшткаў контр-рэвалюцыйнага трацкізму, уся КП(б)Б яшчэ шчыльней згуртуецца пад бальшавіцкім кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) і яе выпрабаванага правадыра — т. СТАЛІНА.

Двурушнікам ня месца ў радох партыі

(З рэзалюцыі аб'яднанага пленуму Вульскага РК КП(б)Б і РКК)

Пераможнае сацыялістычнае наступленьне на ўсім фронце праходзіць ва ўмовах жорсткага клясавага змаганьня шалёнага супраціўленьня клясавых ворагаў унутры Савецкага Саюзу, ва ўмовах узросшай актыўнасьці з боку міжнародных буржуазіі, якая імкнецца сарваць нашае сацыялістычнае будаўніцтва шляхам падрыхтоўкі ваеннага каходу на СССР, стварэньне эканамічнай блёкады і арганізацыі шкодніцкіх контррэвалюцыйных груп унутры СССР.

Рабочая кляса СССР і яго неадлучная частка БССР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, вядучы за сабою працоўныя бядняцка - серадняцкія масы вёскі, дасягнула вялізарных посьпехаў у галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, з посьпехам перамагаючы супраціўленьне аджываючых варожых клясаў, бязьлітасна змагаючыся супроць падрыхтоўкі капіталістычнага рэстаўрацыі.

Ці-ж сапраўды правыя выступаюць такімі «абаронцамі» рабочае клясы, як яны гэта хочуць пралставіць? Далёка ня так, гэта толькі адзін з маневраў, адзін з прыёмаў улаўлівання ў апартуністычную сетку прастадушных. Абываталі — адзіная «рыбка», якая можа папасьці ў гэту сетку, але яны і бяз гэтых трукаў вам вераць, паважаныя, яны бачаць, як вы стараецеся, яны вас шануюць. Што-ж датычыць пралетарыяту, дык, наверце, дарэмная праца. Пралетарыят ведае, што вашы словы зусім разыходзяцца з канкрэтнымі вашымі справамі. Пралетарыят шануе вас не па вашых словах, а па адносінах да тых мерапрыемстваў партыі, якія накіраваны на сапраўднае перамаганьне труднасьцяй.

Калі-ж справа датычыць гэтых мерапрыемстваў, правыя паказваюць свой сапраўдны твар. Так, яны супроць арганізацыі закрытых разьмеркавальнікаў, якія, як гэта ўжо практычна паказана, дапамагаюць зьніжэньню затрудненьняў. Яны супроць натурпрэміяваньня ударнікаў, словам, яны супроць усяго таго, што забясьпечвае сапраўднае налажэньне становішча рабочае клясы на аснове генэральнай лініі партыі, але яны, правыя, за арыў сацыялістычнага будаўніцтва, за зьніжэньне яго тэмпаў, за блёк з ворагамі пралетарыяту.

Чаму правыя супроць натурпрэміяваньня ўдарнікаў?

Таму-ж, чаму яны і супроць змаганьня з ліквідатарамі, таму, чаму яны, правыя, і супроць ударных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, супроць генэральнай лініі партыі. Яны хочуць падмяніць намаганьні пралетарыяту, які будуе сацыялізм, апартуністычнай балбатняй, бо:

«Вытворчая дэмакратыя бяз прэмій натурай, без дысцыплінарных судоў—адна балбатня» (Ленін, т. XVIII, ч. 21, стар. 25).

Вось як ставіў пытаньне Ленін, так і зараз ставіць гэтае пытаньне, так і праводзіць яго ў жыцьцё камуністычная партыя.

Як на яркі факт разыходжаньня паміж словамі і справамі правых, трэба паказаць на факт «гаспадараньня» Фрумкіна, аднаго з правадыроў прапаў апазыцыі ў «Саюзрыбе». Двурушніцкі ашуканчы партыю вазвані аб адмаўленьні ад правых поглядаў і установак, асуджаных XVI зьездам партыі, Фрумкін на практыцы зрываў выкананьне праграмы рыбнай лоўлі. **Кожная лішняя тона рыбы сапраўды дапамагае палепшыць становішча рабочае клясы.** І вось, у той час, як паплечнік Фрумкіна—т. Рыкаў расьпінаецца аб неабходнасьці накарміць рабочую клясу, сам Фрумкін зрывае выкананьне запраектаванага пляну лоўлі рыбы. Сапраўды двурушніцкая, здрадніцкая палітыка.

Імкненьне зьнізіць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, хістаньні, двурушніцтва—характэрная рыса апартуністых, якія сеюць паніку ў радох пралетарыяту.

«Хісткія правадыры» абярнуліся ў ныцікаў і малаверaў, хныкаюць перад трудпасьцямі, гатовы адмовіцца ад далейшага разьвіцьця і ўзмацненьня пралетарскай дыктатуры, гатовы пайсьці на здачу вазыцый пралетарыяту. Таму змаганьне супроць правых зьяўляецца неабходнай умовай перамаганьня труднасьцяй, неабходнай умовай далейшага прасоўваньня ўперад. Гэта змаганьне неабходна для забясьпячэньня посьпеху сацыялістычнага будаўніцтва ва ўмовах завостранага клясавага змаганьня, ва ўмовах наяўнасьці сапраўдных труднасьцяй.

«Мы—партыя, якая змагаецца ва ўмовах завостраных труднасьцяй. Мы павінны сказаць сабе: каб адзінства было моцным, трэба, каб быў асуджан пэўны ўхіл»—так ставіў пытаньне **Ленін.**

Партыя асудзіла правы ўхіл. Гэтым самым партыя абавязвае кожнага, хто выразнуў сапраўды парвазць з поглядамі правых—выкрываць антыленінскую сутнасьць правага ўхілу. Бяз гэтага нельга быць бальшавіком, нельга быць ленінцам.

І далей, аб прымірэнцах. Гэтыя абываталі ў партыі зараз «спічаць пэптам» аб тым, што, «даруйце, нельга-ж»... Яны, вядома, супроць правага ўхілу, але чаму-ж так востра ставіць пытаньне. Прымірэнцы ставяць пытаньне так, што можна весьці змаганьне з двурушнікамі ўнутры партыі (г. зн., НЕ выключаючы іх з партыі), што Сьляпкоў—талеработнік, што ён быў калісьці, нават, у складзе ЦК УсеКП(б), што трэба падышчвасьці таварыша і т. д. Гэтыя абываталскія гутаркі — нішто іншае, як ускосная салідарызацыя з правымі. Бо можа быць адно з двух: або погляды правых варожы партыі, і тады — пра вільнае змаганьне з гэтымі поглядамі і іх посьбітамі, або—партыя ня мае рацыі: можна цярпець гэтыя погляды, можна мірна ўжывацца з імі.

Бальшавіцкай партыі, адкажам мы, не ўласьцівы кампрамісы, не ўласьціва «мірнае сужыцьцё» з якімі-б тамі ні было варожымі дыктатуры пралетарыяту антыкамуністычнымі поглядамі, бальшавіцкай партыі ўласьціва рэвалюцыйная нецярпімасьць. А што да «печальников», якія баяцца даць сапраўдную ацэнку дзеяньням правых, баяцца на асабістых, абываталскіх пратэстаўленьнях сказаць аб іх што-небудзь, дык ім трэба адказаць словамі Леніна, напісанымі з повада здрадніцтва вэнгерскіх сацыялістых:

«Няма сумненьня, што частка вэнгерскіх сацыялістых шчыра перайшла на бок Бэла Куна і абвясьціла сябе шчыра камуністымі, але сутнасьць справы ад гэтага нікольскі не зьмяняецца. Чалавек, які «шчыра» сябе абвяшчае камуністым, які на справе замест бязьлітасна-цьвёрдай, няўхільна-рашучай, аддана-сьмелай і гэройскай палітыкі (толькі такая палітыка адпавядае прызнаньню дыктатуры пралетарыяту),—хістаецца і маладушнічае — падобны чалавек сваёй бесхарактарнасьцю, сваімі хістаньнямі, сваёй нерашучасьцю робіць такую-ж здраду, як і непасрэдны здрадник. У асабістым сэнсе розьніца паміж здрадніком на слабасьці і здрадніком па «умысле», разьліку —вельмі вялікая; у палітычных адносінах гэтай розьніцы няма, бо палітыка—гэта фактычны лёс мільёнаў людзей, а гэты лёс не зьмяняецца ад таго, ці праданы мільёны рабочых і бедных сялян здрадніками па слабасьці, ці здрадніка́мі з карысьліваські». (Ленін, т. XVII, стар. 15, падрэсьлена Леніным).

У клясавым змаганьні няма месца «сантымэнтам» і асабістаму настрою, бо палітыка—гэта ёсьць лёс мільёнаў людзей.

Л. ЯКАЎЛЕЎ.

Аб фракцыйнай антыпартыйнай рабоце Сырцова і Ламінадзэ

Пастанова бюро МК УсеКП(б) сумесна з кааўнымі членамі прэзыдыуму МККК і з сакратарамі райкомаў Масквы ад 3 лістапада 1930 году

Заслухаўшы і абмеркаваўшы паведамленьне аб фракцыйнай рабоце Сырцова-Ламінадзэ, накіраванай супроць партыі і яе ЦК, бюро МК, на аснове матар'ялаў ЦККК, лічыць устаноўленым:

1. што Сырцоў арганізаваў падпольны фракцыйны цэнтр, у склад якога ўваходзілі: Нусінаў, Каўрайскі, Гальпэрын, Курс і інш.;

2. што Ламінадзэ, са свайго боку, знаходзіўся на чале канспірацыйнай фракцыйнай групы, якая захавалася і ўмацавалася і ў склад якое ўваходзілі Шацкін, Рэзьнік і інш.;

3. што абедзьве гэтыя фракцыйныя групоўкі блёкаваліся для сумеснага змаганьня супроць партыі і яе кіраўніцтва.

Гэтыя групоўкі, як цяпер гэта выясьнілася, захоўвалі сваё існаваньне на працягу доўгага пэрыяду (да зьезду, у час і пасьля XVI зьезду партыі), прыкрываючыся дэклярацыямі аб поўнай згодзе з генэральнай лініяй партыі і аб прызнаньні правільнасьці яе кіраўніцтва.

Група Сырцова-Ламінадзэ, як і ўсе праваўхілісцкія і трацкісцкія элемэнты, ігнаруе сваёвасаблівасьць сучаснага пэрыяду пралетарскай рэвалюцыі, як пэрыяду разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, гігантскага росту сацыялістычнай гаспадаркі, зьвязанага з рэзкім абвастраньнем клясавага змаганьня і няўхільнымі труднасьцямі, для перамаганьня якіх партыя напружвае ўсе свае сілы і мабілізуе актыўнасьць найшырэйшых пралетарскіх мас.

Сырцоў, Ламінадзэ, Шацкін і інш., дасканала захоўваючы свае сапраўдныя антыпартыйныя погляды, пралезлі ў кіруючыя органы партыі і самыя правакацыйным чынам выкарысталі сваё становішча для арганізацыі фракцыйнага змаганьня супроць палітыкі партыі і яе ЦК.

Сырцоў і Ламінадзэ выступілі на змаганьне супроць партыі ў момант, калі клясавыя ворагі пралетарыяту мабілізуюць усе свае сілы для змаганьня з пралетарскай дыктатурай і з нашай партыяй, калі выкрыты контр-рэвалюцыйныя, шкодніцкія арганізацыі («Прампартыя», «Працоўная сялянская партыя» і інш.) і ўстаноўлена іх простая сувязь з імпэрыялісцкімі інтэрвэнтамі, у момант, калі правыя апартуністыя ўнутры партыі ўзмацняюць сваё змаганьне супроць ЦК і ідэалёгічна ўсё больш і больш змыкаюцца са шкодніцкімі контр-рэвалюцыйнымі арганізацыямі. У гэтых умовах група Сырцова-Ламінадзэ сваім фракцыйным падпольным змаганьнем супроць партыі і яе ЦК стала на пазыцыі правага апартунізму і контр-рэвалюцыйнага трацкізму, стала на шлях падрыву дыктатуры пралетарыяту.

Замест актыўнай дапамогі партыі ў змаганьні за шпаркія тэмпы індустрыялізацыі краіны, за сацыялістычнае перабудаваньне сельскай гаспадаркі, за ліквідацыю кулацтва, як клясы,—група Сырцова-Ламінадзэ пад выглядам самакрытыкі, дыскрэдытуючы гэты бальшавіцкі пёзунг, спэкулюе на труднасьцях. У змаганьні супроць партыі яна паўтарае трацкісцкія і праваўхілісцкія зады аб унутрыпартыйным «рэжыме», паўтарае ўвесь подлы паклёп ворагаў пралетарыяту і іх падпляваў аб кіраўніцтве партыі.

Блёк праваапартуністычнай групы Сырцова, які абвясьцілі у свой час: «накапляйце ў добры час», і підэра «левакоў» поўтрацкістых Ламінадзэ прадстаўляе сабою рознавіднасьць спроб аб'яднаньня праваапартуністычных элемэнтаў (групы т. т. Бухарына, Рыкава і Томскага) з трацкісцкімі і паўтрацкісцкімі элемэнтамі для сумеснага змаганьня супроць партыі.

Той факт, што права-«левая» групоўка Сырцова-Ламінадзэ ядзе змаганьне супроць партыі, стоячы на права-апартуністычных пазыцыях (па пытаньні аб тэмпе сацыялістычнага будаўніцтва і г. д.), цалкам выкрывае фальшывую плявізну поўтрацкісцкіх і трацкісцкіх «лявацкіх» элемэнтаў і яшчэ раз пацьвярджае, што правая небясьпека застаецца галоўнай небясьпекай у партыі.

XVI зьезд зьвярнуў увагу ўсёй партыі на новы манэўр правых і іншых апартуністычных элементаў, які выяўляецца «ў фармальным прызнаньні сваіх памылак і ў фармальнай згодзе з генэральнай лініяй партыі, не пацьвярджаючы свайго прызнаньня работай і змаганьнем за генэральную лінію, што на справе азначае толькі пераход ад адкрытага змаганьня супроць партыі да скрытага, або чаканьне больш спрыяючага моманту для аднаўленьня атакі на партыю».

Гэта двурушніцкая тактыка пацьвердзілася асабліва тым, што выяўленыя партыяй у антыпартыйным фракцыйным блёку Сырцоў і Ламінадзэ прабавалі да самага апошняга моманту ўтаіць сваю фракцыйную дзейнасьць, маляючы паведамленьне аб іх антыпартыйнай рабоце, як паклёп, нагаворы і інш.

Выкрытая фракцыйная работа групы Сырцова - Ламінадзэ яшчэ раз пацьвярджае правільнасьць папярджаньня XVI зьезду партыі аб новым манэўры правых і «левых» апартуністых і аб неабходнасьці бязьлітаснага змаганьня з імі.

Бюро МК упэўнена, што ЦК і ЦККК прымуць у адносінах да Сырцова і Ламінадзэ арганізацыйныя меры, выключаючыя з пастаноў XVI зьезду партыі, на спыняючыся, у выпадку неабходнасьці, і перад выключэньнем іх з радоў УсеКП(б).

Выяўленьне фракцыйнай двурушніцкай работы груп Сырцова і Ламінадзэ, а таксама актывізацыі ўсіх апартуністычных і асабліва правых элементаў (Руцін, Сьляпкоў, Марэцкі і інш.) робяць больш неацярпімымі паводзіны былых підэраў правай апазыцыі (Бухарына, Рыкава, Томскага), на выканаўшых пастаноў XVI зьезду аб актыўным змаганьні за генэральную лінію партыі. Бюро МК лічыць, што такія паводзіны членаў ЦК—Бухарына Рыкава, Томскага — павінны стаць прадметам спэцыяльнага абмеркаваньня ЦК і ЦККК.

МК УсеКП(б) заклікае ўсіх бальшавікоў Масквоўскай абласной партыйнай арганізацыі яшчэ больш згуртавацца вакол ленінскага ЦК, праявіць яшчэ большую пільнасьць, ідэёвую і арганізацыйную непрымірымасьць у змаганьні з правымі і «левымі» апартуністымі, двурушнікамі і прымірэнцамі да іх.

МК УсеКП(б) выказвае цьвёрдую непахісную ўпэўненасьць у тым, што, ня гледзячы на ўсе антыпартыйныя і фракцыйныя вылазкі, ня гледзячы на спробы дробна-буржуазных элементаў дэзарганізаваць работу партыі і падарваць жалезную згуртаванасьць ва радоў, наша партыя будзе і надалей цьвёрда і няўхільна, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, ісьці ўперад па шляху пераможнага будаўніцтва сацыялізму, па шляху ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі.

Апартуністы Нікіфараў зьняты з работы

Бюро ЦК КП(б)Б пастанавіла за рад праваапартуністычных установак, за нізкія паказальнікі ў рабоце раёну па выкананьні раду асноўных гаспадарчых і загатоўчых задач — сакратара Любаньскага райкому КП(б)Б Нікіфарава зьняць з кіруючай партыйнай работы.

Правыя апартуністыя і разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва

XVI зьезд партыі абвясьціў погляды правых апартуністых несумяшчальнымі з прабываньнем у радох УсеКП(б). На гэтым зьезьдзе былі падведзены вынікі двухгадовага змаганьня партыі з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва, а таксама з рэшткамі трацкісцкай ідэалёгіі, якая зьяўляецца ідэалёгіяй упаўшага ў роспач дробнага буржуа. Перад XVI зьездам УсеКП(б) атакі правых апартуністых па генэральную лінію партыі значна ўзмацніліся. Правыя карысталіся ў гэтых атаках і арсэналам трацкізму, як ідэалёгічным багажом (спробы дыскрэдытаваць ЦК, пэрсанальна тав. Сталіна і г. д.), і эпігонамі трацкісцкай апазыцыі, як саюзьнікамі.

Разьбітыя на XVI зьезьдзе, правыя апартуністыя заяўлялі вуснамі Томскага і Рыкава аб адмаўленьні ад фракцыйнага змаганьня, аб прызнаньні генэральнай лініі партыі і аб тым, што яны і надалей будуць яе няўхільна праводзіць у жыцьцё.

Партыя паставіла перад правымі ўмову—штодзённа змагацца за генэральную лінію, выкрываць перад шырокімі партыйнымі і рабочымі масамі антыбальшавіцкую, контр - рэвалюцыйную, па сутнасьці справы, існасьць правага ўхілу. Выкананьне гэтае ўмовы павінна было паказаць і даказаць шчырасьць асуджэньня правымі іх раней шых памылак, цьвёрдасьць іх выпраўлэньня паправіцца, стаць на шлях выкананьня ўсіх настаноў партыі. **Гэтае ўмовы правыя ня выканалі.**

Прызнаючы на словах правільнасьць лініі партыі, б'ючы сябе ў грудзі адной рукой, правыя апартуністыя працягнулі другую руку ворагам рэвалюцыі, тым самым здраджваючы інтарэсам партыі, інтарэсам дыктатуры пралетарыяту. Гэта невыпадкова. Самы характар правай апазыцыі, яе асноўныя прынцыповыя ўстаноўкі на тое, «што капіталістычныя элемэнты або самі адамруць нярыкметна, або будуць урастаць у сацыялізм», прывялі правых да простай садзейнасьці капіталістычным элемэнтам у падрыхтоўцы зьвяржэньня дыктатуры пралетарыяту.

Тав. Сталін яшчэ на XVI партыйным зьезьдзе даў гэтаму вычарпальную палітычную характарыстыку, сказаўшы:

«Ня можа быць сумненьняў, што перамога правага ўхілу ў нашай партыі значала-б поўнае разбураньне рабочае клясы, узбраеньне капіталістычных элемэнтаў у вёсцы і нарастаньне шансаў на капіталістычную рэстаўрацыю ў СССР».

Правыя ў сваім бяспрынцыпным змаганьні супроць партыі блёкаваліся з трацкістымі невыпадкова. Іх блёк з трацкістымі ёсьць блёк апартуністычных элемэнтаў, якія прадстаўляюць дробна - буржуазны радыкалізм і дробна-буржуазны лібэралізм, для сумеснай атакі супроць лініі партыі. **Гэты блёк ёсьць блёк капітулянтаў, адкрытых і скрытых,** выкліканы пераможным наступленьнем сацыялізму на капіталістычныя элемэнты ў нашай краіне, выкліканы завастрэньнем клясавага змаганьня і ўзмацненьнем націску дробна-буржуазнай стыхіі на наасобныя зьвены нашай партыі.

«Момант зараз такі—можна сказаць, паўтараючы словы т. Леніна, —што стыхія бесспартыйная падаецца тым дробна - буржуазным кістэньням, якія пры сучасным эканамічным становішчы Расіі няўхільны». (Ленін, т. XVI стар. 145).

Гэты націск параджае хістаньні ў наасобных зьвеньнях нашае партыі, параджае правы ўхіл—праяўленьне дробна-буржуазнага лібэралізму і «левы»—праяўленьне дробна - буржуазнага радыкалізму.

Варожыя пралетарыяту сілы дасканала ацэньваюць ролю правых, колькі-б правыя не прабавалі крычаць аб тым, што яны навінна пацярпелі, колькі-б яны не стараліся упэўніць партыю ў добрай пажаданасьці іх намераў. Прыпамятаем: Устраляў рабіў Бухарыну рэвэранс: «пакуль гаворыць Бухарын, я магу маўчаць». Ці зразумелі, ці пачулі гэта прызнаньне, ці абмежаваліся, ці пазвялі правыя з варожымі пралетарыяту элемэнтамі? Гэтага ня было зроблена. Ва ўсякім выпадку практыка гаворыць аб іншым, аб тым, што **шкодніці часта групуюцца і працуюць пад прыкрыцьцём праевых.** Аб гэтым сьведчыць выкрыцьцё шкодніцкай арганізацыі ў Саюзкіно, установе, якою кіраваў адзін са «звезд» правай апазыцыі—Руцін, аб гэтым сьведчыць супаданьне тэарэтычных установак правай апазыцыі і кадэцка-меншавіцкай кандрацьцэўска-громан-суханаўскай контр-рэвалюцыйнай шайкі.

Вельмі паказальна супаданьне поглядаў трацкістых — аб немагчымасьці пабудовы ў СССР сацыялізму бяз сусьветнай рэвалюцыі — з поглядамі кандрацьцэўцаў. Таксама паказальна, што з гэтай «левай» тэорыі кандрацьцэўцы рабілі вывады, якія супадалі з тэорыяй правых. Бухарынская тэорыя «ўрастаньня кулака ў сацыялізм» знайшла свае падабенства з чаянаўскай тэорыяй аб «вэртыкальнай

Вышэй тэмпы збожжазагатовак! Зламаць кулацкі сабатаж!

НАРКАМПРАЦЫ

СУПРОЦЬ СЬВІНАГАДОЎЛІ?

ПА ЯГО ВІНЕ ЗРЫВАЕЦЦА ПАБУДОВА СЬВІНАРНІКАЎ

НКП БССР ня выконвае дырэктыў ураду

Зводна апошняй пастановы СНК БССР, саўгасы трэсту «Сьвіназод» павінны паставіць да 1 студзеня 1931 г. 20.000 сьвіназматак.

Паводле даных на 10 лістапада, у саўгасах пастаўлена 13.240 матак — 70 проц. заданьня. Значныя марудныя тэмпы будаўніцтва сьвінарнікаў рэзка адбіваюцца на ходзе ўкамплектаваньня. Праграма будаўніцтва стаіць пад сур'ёзным ударам. Белкалгасбуд упарта ня выконвае сваіх абавязацельстваў і зрывае пабудову сьвінарнікаў. Замест 20.000 сьвінамесц. Белкалгасбуд пабудаваў толькі 1.686. У працэсе будоўлі знаходзіцца 10.300 сьвінамесц.

Мы ня раз сыгналізавалі што Наркалгасы БССР упарта ня выконваюць дырэктыў ураду аб забесьпячэньні будаўніцтва ў саўгасах «Сьвінавода» рабочай сілай. Гэтыя сыгналы пасялі ў кагэсты. **Наркампрацы і да сёньняшняга дня ня выканаў натэгарычнай дырэктывы СНК БССР аб забесьпячэньні будаўніцтва сьвінарнікаў рабочай сілай і спэцыялістымі.**

З цэлага раду саўгасаў паступаюць трывожныя весткі аб тым, што будаўнічыя работы стаіць пад пагрозай сьпіненьня з-за значнага недахопу рабочай сілы. Так, саўгасы Ваноць, Паленлюм і імя Сталіна паведамляюць, што будаўніцтва сьвінарнікаў зрываецца. Прычына — амаль поўная адсутнасьць рабочай і тэхнічнай сілы.

Што-ж канкрэтна ўжыў Наркампрацы Беларусі, каб выканаць дырэктывы ўраду і забясьпечыць бесьперабойны ход будаўніцтва? Паўтараем — нічога.

Наркампрацы разаслаў на месцы агульны цыркуляр па пытаньні забесьпячэньня будаўніцтва сьвінарнікаў рабочай сілай і на гэтым паставіў крыжык. Далей цыркуляра справа не пайшла. Вярбоўка рабочых органамі Наркампрацы фактычна зусім не разгорнута. Колькасьць рабочай сілы, завербаванай органамі НКП БССР, не павялічылася.

Такое становішча ў далейшым нецярпіма. Неабходны рашучыя і энэргічныя мерапрыемствы. **Трэба прымусіць Наркампрацы выканаць дырэктыву СНК БССР і неадкладна забясьпечыць будаўніцтва сьвінарнікаў рабочай сілай.**

Шырэй разгорнем фронт змаганьня за сацыялістычныя фабрыкі мяса. Будзем мацней біць па апартуністых, якія, кулаку на выгаду, імкнуцца затармазіць вырашэньне праблемы жывёлагадоўлі. Дакладна ў тэрмін, ні на адну гадзіну пазьней сьвінаводныя саўгасы і калгасы павінны быць цалкам укамплектаваны сьвінаматкамі. Дакладна ў тэрмін, ні на адну гадзіну пазьней, павінна быць выканана праграма будаўніцтва сьвінарніка. Просты абавязак раённых арганізацый КП(б)Б — забясьпечыць выкананьне гэтых задач.

Баявыя тэмпы калгасу „Гром"

Калгас «Гром», Буда-Кашалеўскага раёну, энэргічна змагаецца за разьвіцьцё сьвінаводзтва. Калгасьнікі ўзялі ўдарныя тэмпы работы ў будаўніцтве сьвінарніка і ўкамплектаваньні сьвінаматачнага стада. Вынікі ў пачаткасьці. **С.-г. арцель «Гром» першай з усіх калгасаў раёну цалкам і поўнасьцю выканала праграму будаўніцтва.** Сьвінарнік быў сваячасова пабудаваны.

Адразу пасьля пабудовы сьвінарніка, калгас скончыў укамплектаваньне. Зараз калгас мае 150 сьвіней. Сьвіноводныя калгасы павінны вучыцца тэмпам работы ў с.-г. арцелі «Гром», якая на справе выконвае дырэктывы партыі і ўраду аб фарсаваным разьвіцьці сьвінагадоўлі.

Нельга не адзначыць, што калгас «Гром», выканаўшы першую праграму будаўніцтва і ўкамплектаваньня, энэргічна ўзяўся за далейшае разьвіцьцё сваёй сьвіноводнай гаспадаркі.

Зараз калгас прыступае да пабудовы новага вялікага сьвінарніку на 200 сьвінаматак. **Калгасьнікі цьвёрда ўпэўнены, што і гэта, яшчэ больш адказная і значная работа, будзе імі з посьпехам выканана.**

Е. С.

ЗЯБЛІВА ІДЗЕ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА

ПАТРОІЦЬ ТЭМПЫ, БІЦЦА ЗА КОЖНЫ ГЭКТАР

Як паказвае апошняя зводка НКЗ БССР, рэспубліканскі плян зяблівы па становішчы на 5-10 лістапада выкананы ў разьмеры 53,2 проц. Прырост за мінулую пяцідзеўку — 11,1 проц. Саўгасы трэстаў узаралі 19.512 га, што складае 43,5 проц. Ганебна адстаюць саўгасы спажывецкіх каапэрацый, якія замест 17.000 га паводле пляну ўзаралі толькі 14.000 га. Калгасы выканалі плян зяблівы на 34,4 проц. Па індывідуальным сэктары плян зяблівы выкананы на 60,1 проц.

Першым у БССР выканаў плян зяблівы ЛОЕЎСКІ раён. Саўгасы, калгасы і індывідуальны сэктар гэтага раёну выканалі заданьне па зяблівы на ўсе 100 проц.

Набліжаюцца да скончэньня зяблівы Сьмілавіцкі, Любаньскі, Рагачоўскі і Аршанскі раёны, якія дабіліся выкананьня пляну зяблівы ў разьмеры 90-93 проц.

Ня гледзячы на бясспрэчныя посьпехі паасобных раёнаў, тэмп зяблівы ў БССР яўна невыстарчальны. На 10 лістапада ў БССР зазяблена толькі 664.818 га. Яшчэ ня ўзораны на зіму 599.084 га, якія трэба ва што-б та ні стала ўзараць у тэрмін.

20 лістапада зяблівы павінна быць скончана. Да гэтага часу ні адзін саўгас, ні адзін калгас, ні адзін раён не павінны пакінуць ніводнага гэктара, няўзаранага на зіму. Разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва, намагаючы ўсе свае сілы, саўгасы і калгасы вёскі павінны цалкам і поўнасьцю да 20 лістапада выканаць заданьне па зяблеве.

ЛЕН І ЗБОЖЖА

ЗАГАТАУЛЯЮЦЦА МАРУДНА

Мацней націск на кулака, біць па апартуністых

Агідныя лічбы, агідныя факты

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Магілеўскі раён ганебна **правальвае** заданьне па **загатоўцы ільну.** Гадавы плян загатоўкі па сёпешні дзень **выканан усяго толькі на 0,5 проц.** Агідная лічба. Прычыны такога правалу ў ільназагатоўках заключаюцца ў апартуністычнай бязьдзейнасьці мясцовых арганізацый, якія яўна недаацэньваюць важнейшага значэньня гэтай работы.

Змаганьне з кулаком, які сабатуе і зрывае ільназагатоўкі, значна **паслаблена.** Шмат якія сельсаветы цягнуцца на поваду ў кулака. Да гэтага часу амаль ва ўсіх сельсаветах Магілеўскага раёну, **кулацкім гаспадаркам ня даны цьвёрдыя заданьні.** Плян ільназагатовак не даведзены да вёсак.

Масавая работа вакол ільназагатовак не разгорнута. Пры сельсаветах ня складзены камісіі садзейнасьці загатоўкам. Загатоўчыя арганізацыі заместа таго, каб фарсаваць тэмпы загатовак, спрачаюцца паміж сабой, колькі хто павінен загатовіць ільну. Райгандаль абмежаваўся толькі тым, што даў заданьні і ўсё. Райкаапсаюз зрывае апрацоўку ільну. На складзе райкаапсаюзу ляжаць мёртвым грузам 30 ільнамялак і 2 ільнатрапалкі.

Ал. ЛЯСНЫ.

Бязудзельныя сьведкі

БССР займае **адно з першых месц** у Савецкім Саюзе ў галіне ільнярства. Гэта ставіць перад намі адказныя і баявыя задачы па выкананьні дырэктыў XVI зьезду УсеКП(б) аб фарсаваным разьвіцьці тэхнічных культур.

Трэба, аднак, з усёй выразнасьцю падкрэсьліць, што тэмпы разьвіцьця тэхнічных культур да сёпешняга дня зьяўляюцца **далёка невыстарчальнымі.** Зямельныя органы яўна **недаацэньваюць і ігнаруюць** значэньне ільнярства. Такая-ж недаацэнка мае месца і з боку цэлага раду цэнтральных арганізацый.

Ні адна арганізацыя ня ведае, колькі ільну і канапель ужо апрацавана. Ніхто ня можа адказаць, ці аддзелена семя ад саломы. Плян загатовак ільнаваўлакна выканан прыблізна на 0,5 процантаў, а ільну-семя—на 20 проц. Канкрэтныя і энэргічныя мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі фарсаваньне апрацоўкі і загатоўкі тэхкультур, да сёпешняга дня ня прыняты. Плян загатовак ільну і канапель стаіць пад сур'ёзнай пагрозай. Кулак, як правіла, цьвёрдых заданьняў не атрымаў.

У сьвятле гэтых фактаў праваапартуністычнай практыкі **зусім недапушчальнымі** зьяўляюцца паводзіны раду газэт нашых ільнаводных раёнаў, якія (газэты) **усё яшчэ ўпарта замаўчваюць сапраўднае становішча рэчаў.**

Да газэт-маўчальнікаў трэба адносьці былыя акруговыя газэты **«Чырвоная Полаччына», «Віцебскі Пралетары» і «Камунар Магілеўшчыны»,** якія, абслугоўваючы асноўныя ільнаводныя раёны БССР, **проста ігнаруюць пытаньне тэхнічных культур.** Мы прагледзелі комплекты гэтых газэт, пачынаючы з 1-га лістапада. І што-ж? На старонках перадлічаных газэт можна знайсьці матар'ял аб чым хочаш, толькі **ні аднаго слова пра лён.** Нібы лён расьце ў Крыме, а ня ў Полаччыне, Віцебшчыне і Магілеўшчыне. За Кастрычнік у «К. М.», «В. П.» і «Ч. П.» зьмешчана літаральна некалькі невялічкіх, нагрунтоўных падборак аб тэхкультурах агульнага характару.

Віна за ганебна нездавальняючы кошт загатоўкі і апрацоўкі тэхнічных культур **падае і на друк** ільнаводных раёнаў, на газэты **Полаччыны, Віцебшчыны, Магілеўшчыны.** Яны не мабілізавалі пралетарскай грамадзкасьці і мас калгасьнікаў і адзіначасобніку — бедняку і сераднякоў — вакол задач разьвіцьця тэхнічных культур, на змаганьне за своячасовае і поўнае выкананьне пляну загатовак ільну.

Газэты - маўчальнікі «Віцебскі Пралетары», «Чырвоная Полаччына» і «Камунар Магілеўшчыны» прайшлі міма апартуністычнай бязьдзейнасьці мясцовых арганізацый, не змагаліся і не змагаюцца з канкрэтнымі вінаватымі ў зрыве загатоўкі і апрацоўкі ільну, не выкрываюць канкрэтных фактаў і несьбітаў праваапартуністычнай практыкі, якая ёсьць у радзе ільнаводных раёнаў (Магілеўшчына і інш.).

«Віцебскі Пралетары», «Чырвоная Полаччына» і «Камунар Магілеўшчыны» павінны неадкладна выправіць сваю грубейшую памылку і ўступіць у бой за тэхнічныя культуры, за сырэц для нашай прамысловасьці.

ФАБРЫКА **МЯСА**

Саўгас — агітатар

Туды ідуць са скупымі блёкнотамі людзі ад газэты, каб пасьля хоць сьціслa расказаць пра марудныя і плённыя будні аднаго з старэйшых і найлепш укамплектаваных сьвінагадоўчых саўгасаў.

Туды ідуць з зацікаўленасьцю, разбураючы муры недавер'я, экскурсанты — калгасьнікі, беднякі і сераднякі-адзіначасобнікі — каб пераканацца ў дасягненьнях і перавагах буйное сацыялістычнае жывёлагадоўчае гаспадарцы.

Адразу кідаецца ў вочы поўная гармонія ліній у разьмяшчэньні будынкаў. Будынкі у большасьці—новыя, пакрытыя бляхай.

Івань мае 869,84 гэкт. зямлі, з яе 533 гэкт.—пахаці.

У цэнтральнай канторы гуде бас дырэктара саўгасу тав. **Кавалёва:**

— Сёньня 1-ае. А ў нас ужо Кастрычнік! Радасьць из тварах! А чаму? Прыбралі ўсё з палёў, а работамі справіліся—вось чаму!..

— Вы-б прыехалі, калі шлёс па полі яшчэ стаіў—паволі заўважае рабочы-пакаёўка, — па-за-раз паглядзелі-б! І рахункаводы і дырэктыя—усе ля вазоў мітусіліся, усе паспавалі. Ды як!

Саўгас дапамог селета індывідуальнаму сэктару ў вопыце (заарана 12 гэктараў) і суседнім калгасам «Трактару» і «Новому Жыцьцю» (зжата 20 гэктараў жыта).

Рыпіць дэнверы і на паросе вырысуюцца жаночыя постаці.

А гэта — дзяўчына нашага сьвінаводу Мар'я Аляксандраўна Баранава, — гаворыць аб'ектыў - арганізатар,—яна вынаймае вас дзельна а пастаноўкай сьвінагадоўчае справы ў Івані.

Пачалі з невялічкага

Мэтавая ўстаноўка саўгасу — даць народысты, правільна выхаваны маладняк.

У 1929 годзе Наркамзем БССР атрымаў для Івані з гаспадарак Дзяржлемкультуры — Алексееўскага, Радамановка і Аксаева — 20 сьвінаматак і 2-х кнэрыў. А на 10 кастрычніка г. г. мы мелі тая ужо 69 васьмімесячных сьвінаматак, 67 сьвінаматак, узростам ад 4 да 8 месяцаў і 42—да 4-х месяцаў. 69 сьвінаматак Івані дадуць весьнавы анарэс.

Паводле пляну мяркуецца павялічыць агульную колькасьць сьвінаматак яшчэ на 150 штук.

Івань укамплектоўвае з сваіх племяздапальнікаў выключна саўгасы. Сёлета ён не атрымалі: саўгас імя Сталіна —20 сьвінаматак і Боркі—6

„Лэдзі" з Івані

Зараз сьвіньні ў Івані амаль выключна белай ангельскай породы, йоркшыры. Дамішуюць 3 лініі—Вэнэра, Вундэра і Турка.

Адну з іх, клічкай «Лэдзі», нам удалося зняць на аб'ектыў фотаапарату.

«Лэдзі» ганарыцца сваімі адменнымі асобнымі якасьцямі сьвіньні, чыстым паміжпальцавым і ўзорным доглядам. Па вушы яна ходзіць з адчуваньнем уласнасьці.

Яна мае рацыю. Усе іваньскія «лэдзі», з лічкамі пітачком і крутымі хвосьцікамі, карыстаюцца надзвычайнай увагай работнікаў сьвінававоду.

Удасканалена кажучы, імённа акуратнасьцю ў доглядзе, своеасаблівай напаванай да гэтае «лэдзі» жывёлы, стварэньнем імуніцету ад усіх не хваробі і выгадаваньня Іваць трэстам «Сьвінавод», як адзін з лепшых племянных сьвінагадоўчых саўгасаў на Беларусі.

Тут асабліва пацьвярджаецца правіла: справа ня толькі ў колькасьці, колькі ў якасьці...

Галоўнае — у доглядзе

Вось як праходзіць працоўны дзень на сьвінаводзе: ад 6 да 8 гад. раніцы —кармленьне і гатаваньне корму; ад 8 да 10—перапынак; ад 10 да 2—уборка і кармленьне. І, нарэшце, увечары ад 6 да 8 ідзе зноў раздача корму. Маладняк корміцца аўсянай мукой, сланечнымі і ільнянымі клінцамі; дарослым да гэтых прадуктаў дадаецца бульба.

Сурова захоўваецца норма. Дарослыя сьвіньні корміцца паводле норм Цапова, а маладняк—паводле норм дацкага спэцыялістага Хансэна. Для дарослых сьвіней існуе індывідуальная норма (асобна—паросным, падсосным, кнурам).

„Абясстоленыя" сьвінарнікі

Цяпер у саўгасе шырока разгорнута будаўніцтва 6-ці новых сьвінарнікаў. Адзін ужо зусім гатовы, другі будзе хутка скончаны.

Але галоўная загана ў тым, што нейкія гора-архітэктары выраішылі панаватарстваваць — паставіць сьвінарнік... бяз столі.

— Ведаеце, — кажа т. Баранава, — я жыва ня буду, а прымушу іх зьмяніць праект, нельга-ж дапусьціць, каб нарасты з холаду пагінулі!

У дадатак да «абясстоленьня» сьвінарнікі ніяк не дапасаваны да мэханізацыі. У іх нельга пусьціць вагаэтак-кармушак. А трэба памятаць, што мэханізацыя, асабліва ў сьвінагадоўчай справе — інтэнсыўная і марудная — адыгрывае вялізарную ролю. Возьмем хоць-бы саўгас імя Шэўчэнка на Украіне. Там вагаэтка, пушчаная на градуяваных рэйках, эканоміць рабочую сілу аж да аднаго чалавека на цэлы сьвінарнік.

Людзі — ударнікі

Давайце пагутарым пра людзей, непасрэднымі імкненьнямі і мускуламі якіх расьце якасьць племягадавальніка.

Сьвінаавод абслугоўвае 10 работнікаў, уключаючы загадчыка і агранома-арганізатара. Паасобныя работніцы працуюць на гэтым заводзе два-тры гады.

Уся работа прасякнута вялікім энтузіязмам перш за ўсё т. **Баранавай.** У яе няма нармаванага дня, поўных гадзін адпачынку. Часта і ночу ў вакно яе пакою калоціцца рантоўны сполах:

— Мар'я Аляксандраўна, што рабіць з «Буяетам»? Шалее, стойла ломіць... Мар'я Аляксандраўна!

Па-ёй раўняюцца іншыя. Работніцы **Урбан, Туціна, Дабравольская** — разьвіваюць таксама ударныя тэмпы, захоплены сацыялістычным спаборніцтвам, укладаюць у сваю справу бязьмежка сіл і адданасьці.

Да Кастрычніцкіх сьвят стары рабочы сьвінававоду, ударнік **Шкляраўскі** ўзнагароджваецца ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу.

Бой з бацыламі

Вэтэрынарны нагляд ў саўгасе выстарчальны. Два-тры разы на тыдзень са Слуцку прыяжджае фэльчар, аглядае жывёлу, дае адпаведныя парады.

У дні, калі няма фэльчара, яго функцыі з посьпехам выконвае Мар'я Аляксандраўна (папулярнейшы чалавек у Івані). Ня столькі сельска - гаспадарчая акадэмія, колькі ўмовы работы зрабілі з т. Баранавай і агранома, і зоатэхніка, і вэтэрынарнага доктара.

Старанная прафілактыка прывяла да таго, што два выпадкі чумных захворваньняў у саўгасе не разрасьліся ў эпізоотыю, а засталіся толькі выпадкамі —адзінкавымі і пустымі.

У новым сьвінарніку сьвіньні стаяць на бэтоннай падлозе з драўлянымі шчытамі. **Там — узорная чыстата, вэнтыляцыя і ацяпленьне.** Там — спэцыяльныя станкі для падкормкі нарасят да двухмесячнага ўзросту.

Каліфорнія пад нагамі

Зараз іваньскія сьвіназводы ставяць практычнай задачай скарыстаньне для корму ў саўгасе рознастайных адкідаў, што атрымліваюцца ў харчэўніх, піўных, жакітах Слуцку. Пра гэта, між іншым, даўно час падумаць і іншым саўгасам.

Характарны нядаўні факт. У Амэрыцы, у штаце Каліфорнія, выключна на адкідах прадпрыемства Мільлер пабудаваў сьвінагадоўчую гаспадарку «Фантана», якая зараз адзьніваецца у 6½ мільёну даляраў.

У сувязі з разьвіцьцём грамадзкага харчаваньня пытаньне максымальнай утылізацыі адкідаў становіцца ў нарадак дня.

... Галіна жывёлагадоўлі, якая ўзбагаціла фэрмэраў Даніі, Нямеччыны, Англіі, перанесена на сацыялістычныя палеткі, з гонарам вырашае ў нас мясную праблему. Саўгас Івань—на перадавой лініі!

ЮРКА ЛЯВОННЫ.

САЎГАС «ІВАНЬ», СЛУЧЧЫНА.

АДНЭЙ БАРАЗНОЙ

Калгас «РУХАВІК» упарта змагаецца за тэмпы. З посьпехам скончыўшы асеньнюю сяўбу, «Рухавік» б'ецца за кожны гэктар зяблева, паставіўшы сваёй задачай выканаць плян у тэрмін.

Ударная работа калгасу робіць вялізнае ўражаньне на ваколічных адзінаасобнікаў.

Надаўна 26 беднякоў і сераднякоў з суседніх пасёлкаў «Чырвоны Сьвет» і «Зара» ўступілі ў члены калгасу «Рухавік». Усе новыя калгасьнікі ВЫЙШЛІ АРАЦЬ ПАД ЗЯБ У АДНУ БАРАЗНУ.

Усім гарсаветам і РВК

Надаючы выключнае значэньне ўсебеларускай культэстафэце, — асноўнай мэтай якой зьяўляецца мабілізацыя працоўных мас на фронт культурнага будаўніцтва і, у першую чаргу, на справу ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі нешысьменнасьці, — прапаную аказаць максымальную садзейнасьць і дапамогу з боку гарсаветаў і райвыканкомаў ва ўсёй рабоце штабаў культэстафэты.

Падкідпа заслухоўваць даклады штабаў на прэзыдыумах гарсаветаў і райвыканкомаў — аб ходзе работы па правядзеньні культэстафэты.

Старшыня СНК **М. ГАЛАДЗЕД.**

ЗА ШЫРМАЙ „АБ'ЕКТЫЎНЫХ ПРЫЧЫН"

чырвона-слабодзкае кіраўніцтва патурае кулаку і зрывае збожжазагатоўкі

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА.

З 12 сельсаветаў раёну толькі 2—Смоліцкі і Чапліцкі — выканалі да 1-га лістапада 75-80 проц. кастрычніцкага заданьня. па збожжазагатоўках, тры сельсаветы ня выканалі нават верасьнёўскай нормы.

Наогул, кастрычніцкі плян па раёне на 1-га лістапада выканан толькі на 29 проц., што стварае пагрозу своячасоваму выкананьню заданьня па збожжазагатоўках.

Кіраўнікі раённых арганізацый імкнуцца знайсьці аб'ектыўныя прычыны, каб тлумачыць прарывы на збожжазагатоўчым фронце: «арганізацыя была занята бульбазагатоўкамі, не хапае работнікаў, шмат кампаній».

Але пры сур'ёзным аналізе становішча работы прыходзіцца адкінуць гутаркі аб «аб'ектыўных прычынах» і канстатаваць, што прарыў зьявіўся **вынікам нядбайнасьці паасобных раённых работнікаў, адсутнасьці мабілізацыі ўвагі ўсяе арганізацыі вакол збожжазагатовак, «чахарды» з пасылкай раённых работнікаў на вёску і,** парэшце, апартуністычных адносін да важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній.

Ні адзін з членаў бюро РК ня быў пасланы на вёску, мабілізаваньня бюро РК самавольна пакідалі сельсаветы, да якіх яны былі прымацаваны, бюро па гэта не рэагавала.

Ніякай масавай растлумачальнай работы сярод беднаты не праводзілася. У некаторых мясцох агульныя бяднацка-сераднацкія сходы ня прымалі пляну збожжазагатовак.

На пленуме Бучацінскага сельсавету, які дагэтуль яшчэ ня выканаў верасьнёўскага пляну, беднякі падавалі запіскі, у якіх адзначалі боязьнь выступаць з-за пагроз кулацтва, але ячэйка і сельсавет не рэагавалі на запіскі.

Аб правым апартунізьме па практыцы, які праводзіць Чырвона-Слабодзкі РВК, сьведчаць наступныя факты. Прэзыдыум РВК дагэтуль не зацьвердзіў ніводнай пастановы прэзыдыуму Чапліцкага сельсавету аб штрафаваньні кулацка--заможных гаспадарак. **Кулакі па ўсім раёне выканалі толькі 44 проц. заданьня, кулацка-заможныя гаспадаркі Бучацінскага і Жылехаўскага сельсаветаў здалі толькі 10-13 проц. належнай з іх нормы.**

Але ні адзін кулак ня прыцягнут да судовай адказнасьці. Штрафы ня ўжываюцца. Зразумела, што клясавы вораг карыстаецца мяккасьцю раённых арганізацый і ўпарта супраціўляецца здачы збожжавых лішкаў.

Вышэй мы адзначалі, што Чапліцкі сельсавет амаль поўнасьцю выканаў кастрычніцкі плян. Там ячэйка, ня ў прыклад іншым, па-бальшавіцку падышла да збожжазагатовак. Старшыня сельсавету рабочы—25-тысячнік **Галоўчанка** ўзяў на сябе кіраўніцтва ўсёй работай, праведзена шырокая растлумачальна-масавая работа сярод бяднацка-сераднацкіх мас, зроблен рашучы націск на кулацка-заможную частку.

Нельга не адзначыць перабояў у прыёмцы збожжа чырвоных абозаў. На ссыпным пункце ў вёсцы Малышэвічы здатчыкі збожжа прастаялі некалькі гадзін з-за адсутнасьці прыёмшчыка, на пункце ў Жылехаве чырвоныя абозы з-за дрэннай прыёмкі прымушаны былі вяртацца назад, не здаўшы збожжа.

Вось вам «аб'ектыўныя» прычыны!

Толькі пры неадкладнай мабілізацыі ўсёй раённай арганізацыі, пры рашучым выкарчоўваньні бездакназных і праваапартуністычных адносін да збожжазагатовак, пры мабілізацыі бяднацка-сераднацкіх мас на змаганьне з кулаком можна выправіць дапушчаныя памылкі і своячасова скончыць збожжазагатоўкі.

Я. М. ЯКАЎЛЕЎ.

Бярэце з іх прыклад

З месц паступаюць весткі аб нарастаньні хвалі чырвоных абозаў імя XIII-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Калгас імя Дзяржынскага, БУДА-КАШАЛЕЎСКАГА РАЁНУ, у дзень сьвята арганізаваў чырвоны абоз, якім здаў 13 тон збожжа.

Вёскі Станькава, Коскі, Міндалавічы, КОЙДАНАЎСКАГА РАЁНУ, арганізавалі вялікі чырвоны абоз з 65 фурманак, здаўшы ў падарунак 13-й гадавіне Кастрычніка 13 тон збожжа.

У гонар раённай канферэнцыі калгасьнікаў у м. КРУГЛАЕ прыбыў чырвоны абоз з 116 тон збожжа.

Вёска Бязбожнік, Дукорскага сельсавету, СЬМІЛАВІЦКАГА РАЁНУ, выканала ўзятае на сябе абавязацельства— да 13 гадавіны Кастрычніка здаць усе збожжавыя пішкі.

Перавыканалі гадавое заданьне некаторыя калгасы Случчыны. Так, калгас «Савецкая Беларусь» здаў 120 проц. гадавога заданьня, калгас імя Розы Люксэмбург — 117 проц., калгас імя 1-га жніўня выканаў гадавое заданьне па здачы збожжа на 116 проц.

Выканаў поўнасьцю заданьне калгас імя Сталіна, Машканскага сельсавету, Віцебскага раёну.

Асноўная задача дня — шырока разгарнуць арганізацыю чырвоных абозаў імя 13-га Кастрычніка, шчыльней увязаць выкананьне загатоўчых пляноў з арганізацыяй калгаснага прыліву і моцна ўдарыць па кулаку і яго агентуры, якія тармозяць выкананьне збожжазагатоўчых пляноў.

Кулак сабатуе здачу збожжа

ВІЦЕБСК. (Наш. кар.). Тэмпы загатовак збожжа ня Віцебскім раёне не гарантуюць своячасовага і поўнага выкананьня заданьняў. Плян збожжазагатовак выкананы да 1 лістапада толькі на 50 проц. Сацыялістычны сэктар вёскі здаў толькі 32 проц. належачага з яго збожжа. Асабліва трэба адзначыць слабую здачу збожжа на цьвёрдых заданьнях кулацкімі гаспадаркамі. Ці РВК ні каапсаюз ня ведаюць, колькі збожжа ўжо здалі кулакі. Паводле прыблізных вестак, кулацкія гаспадаркі здалі 366 цэнт. замест вызначаных 1.830.

Ня гледзячы на тое, што па насьпіджэньні РВК стаяла пытаньне аб дрэннай здачы збожжа кулацкімі гаспадаркамі, дагэтуль ніякіх канкрэтных мер у адносінах да кулацкага сабатажу ня прынята. Большасьць сельсаветаў не прысылае вестак, таму нельга ўявіць сапраўднага малюнку выкананьня плянаў.

Чарапашыя тэмпы—вынік злачыннай бязьдзейнасьці

ЧЭРЫКАЎ. (Наш. кар.). Чэрыкаўскі раён адстае ў збожжазагатоўках. Да 1-га лістапада здана збожжа менш 50 процантаў гадавога пляну. Некаторыя сельсаветы (Язэрскі, Верамеёўскі, Рыкаўскі) здалі значна менш належнай нормы.

Прычыны—курс на самацёк у радзе месц, няўменьне зьвязаць збожжазагатоўкі з іншымі гаспадарча - палітычнымі кампаніямі, яўная слабасьць масавай растлумачальнай работы сярод беднаты, сераднякоў і калгасьнікаў, адсутнасьць работы з актывам і, нарэшце, злачынна мяккія адносіны да кулацка - заможнай часткі. Кулацка-заможныя гаспадаркі выканалі толькі 25—30 проц. даных ім цьвёрдых заданьняў.

Усе арганізацыі раёну павінны падбальшавіцку ўзяцца за работу, каб на працягу лістапада скончыць загатоўкі. Патураньню кулацтву трэба неадкладна палажыць канец. Павінны быць ужытыя самыя рэпрэсіўныя меры ў адносінах да кулацкага сабатажу.

А. К—н.

ЗНОЎ ТРЫВОЖНЫЯ ЛІЧБЫ!

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ НЯ ВЫКОНВАЕ ЎДАРНАЙ ПРАГРАМЫ ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ

КІРАЎНІЦТВА ПРАДПРЫЕМСТВАМІ У КАСТРЫЧНІКУ АДПАЧЫВАЛА

УДАРНІКІ! РАВКОРЫ! НА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВАЎ! НА ШТУРМ ПРАМФІНПЛЯНАЎСКІХ ВЫШЫНЬ!

ВЫМОВА ЗАМЕСТ ДАПАМОГІ

У мінулым гаспадарчым годзе ГУТА «ПРАЦА» мала рад прарываў з прычыны кепскага кіраўніцтва тэхнічнага пэрсаналу, слабай работы заўкому і поўнай адсутнасьці палітасьветработы. Зараз тэхнічнае кіраўніцтва палепшылася. Але заўком і цэхавыя прафкамітэты працуюць пастарому. Заўком ведае толькі адну форму масавай работы — агульныя сходы. Але рабочым абрыдла ходзіць на сходы, бо ніякай РЭАЛЬНАЙ карысьці ад іх яны ня бачылі. Заўком шмат аб чым гаворыць, але МАЛА РОБІЦЬ. На пасаду загадчыка клюбу вылучылі рабочага шкодуда. Была магчымасьць паслаць гэтага вылучэнца на паўтарамесячныя курсы культработнікаў. Але на курсы яго не паслалі. Замест гэтага, вылучэнцу вынесьлі вымову за слабую культработу.

РАБОЧЫ.

„Меры" прыняты — арганізаваны штаб

На Калцэвіцкім фанэрным заводзе «Зьвязда» кастрычнік даў значны прарыў у выкананьні праграмы. Значна кульгае працдысцыпліна. Але замест таго, каб ажывіць работу вытворчай нарады і мабілізаваць масы на ліквідацыю прарыву, заводзкія арганізацыі арганізавалі... штаб для барацьбы з прарывамі. Усе заводзкія арганізацыі цяпер рады—адказнасьць за прарыў усклаўзена на штаб.

К.

Папярэднія вынікі выкананьня вытворчых праграм рэспубліканскай прамысловасьці за кастрычнік сыгналізуюць аб значным зьніжаньні тэмпаў работы у параўнаньні з верасьнем.

Па ШКЛЯНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ праграма выканана ўсяго на 90 проц., прычым, горш за ўсіх працавала гута «КАМІНТЭРН», выканаўшы праграму на 76 проц. МЭТАЛЯПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ выканала праграму на 86,1 проц. Асабліва дрэнна працуе завод «ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТЫ», які выканаў праграму за першую дэкаду кастрычніка ўсяго на 18 проц., «ГОМСЕЛЬМАШ», які выканаў праграму за кастрычнік на 76 проц. І АКУЛЯРНАЯ ФАБРЫКА, якая за 20 дзён выканала праграму на 88 проц. Па ТЭКСТЫЛЬНАЙ прамысловасьці: фабрыка «ДЗЬВІНА» выканала праграму на 85,8 проц., ФАБРЫКА ІМЯ К. МАРКСА — на 83,6 проц. ШВЭЙНАЯ прамысловасьць дае выкананьне праграмы на 89,2 проц., прычым, асабліва дрэнна працуе Магілеўская фабрыка ІМЯ ВАЛАДАРСКАГА, якая выканала заданьне на 37,7 проц. і фабрыка ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА — на 85,5 проц. На лепш справа стаіць па ЗАПАЛКАВАЙ прамысловасьці — 87 проц. Найбольш адстаюць «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА» — 76 проц. і фабрыка «ДНЯПРО»— 72 проц. Вялікі прарыў дае і ПАПЯРОВАЯ прамысловасьць — 82,8 проц. Папяровая фабрыка «ПРАФІНТЭРН» выканала праграму на 89 проц., «СПАРТАК» — на 87 проц., «ГЭРОЙ ПРАЦЫ» — на 80 проц. і «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» — таксама на 80 проц. ЛЕСАПІЛЬНАЯ вытворчасьць выканала праграму на 75 проц., ФАНЭРНАЯ — на 66 проц., БАЧАРНАЯ — на 51 проц. Крычаўскі фасфарытны завод выканаў сваю праграму на 53,7 проц і фасфарытны завод у Каробічах — на 61 проц.

Калі прааналізаваць работу прадпрыемцаў, дык можна упэўнена сказаць, што ў невыкананьні кастрычніцкіх праграм вінаваты ня толькі заводзкія арганізацыі, але і АБ'ЯДНАНЬНІ, ВСНГ і ЦП саюзаў. Ня гледзячы на шматлікія сыгналы друку, ні гаспадарчыя органы, ні прафсаюзныя арганізацыі, НЕ ЗРАБІЛІ АДПАВЕДНЫХ ВЫВАДАЎ.

Толькі зараз ВСНГ узварушыўся і пасылае на прадпрыемствы 12 спэцыялістых для высьвятленьня прычын прарываў і для дапамогі заводзкім арганізацыям.

Учора ў ВСНГ адбылася інструкцыйная нарада спэцыялістых, мабілізаваных на ліквідацыю прарываў. Па прапанова прадстаўніка НК РСІ, брыгада спэцыялістых атрымала таксама даручэньне праверыць код падрыхтоўкі да трэцяга году пяцігодкі і складаньне сустрэчных прамфінпляннаў на 1931 год.

Учора-ж брыгада, у складзе 5 асоб, на чале з т. Васкабойнікавым, выехала ў Віцебск.

РАБОЧАЯ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ ПАВІННА НЕАДКЛАДНА МАБІЛІЗАВАЦЦА НА БАРАЦЬБУ З ПРАРЫВАМІ. УДАРНІКІ, РАБКОРЫ, ПРАФАКТЫЎ, БРЫГАДЫ ДОБРААХВОТНІКАЎ — УСЕ РОБІЦЦА ДЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ. УСЕ ФОРМЫ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА павінны быць ужыты для мабілізацыі шырокіх рабочых мас на барацьбу з непаладкамі і недахопамі на фабрыках і заводах. Нежаданьне кіраўнікоў тых ці іншых арганізацый прыйсьці на дапамогу ўдарнікам у справе ліквідацыі прарываў, усе факты бюракратычных адносін да важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній.

Ні адзін з членаў бюро РК ня быў

БІЧЬ ВЯЗ ЛІТАСЬЦІ ПА ДУШЫ-ЦЕЛЯХ САМАКРЫТЫКІ

Аб чым сыгналізуе межынская справа

УРОКІ МЕЖЫНА

Друк, рабселькоры адыгрываюць вялікую ролю ў справе разгортвання самакрытыкі. Рабселькоры, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, знаходзяцца ў перадавых радах барацьбітоў супроць бюракратызму, хабарніцтва, шкодніцтва, супроць нашых клясавых ворагаў—кулака і нэпмана і іх гаентуры ў радах партыі—апартуністых.

Вось чаму нашы клясавыя ворагі і іх падпявалы — апартуністыя з такой шалёнай злосьцю ядуць барацьбу супроць рабселькораў.

Задача ўсёй прапетарскай грамадзкасьці—своячасова і рашуча рэагаваць на ўсякую найменшую праяву праследваньня і цкаваньня рабселькораў, кваліфікуючы гэта, як барацьбу супроць разгортваньня самакрытыкі.

Справа з цкаваньнем селькоркі Мясьніковай, аб якой мы ніжэй друкуем матар'ял, гаворыць аб тым, што ня ўсе яшчэ партыйныя органы ўзяліся за рэалізацыю важнейшай дырэктывы XIII зьезду КП(б)Б аб самакрытыцы.

Наадварот, у Межынскай партыйнай арганізацыі мы маем ганебнейшы факт, калі, дзякуючы папітычнай блізарукасьці мясцовага парткіраўніцтва, клясававароглы элемэнт у саюзе з паасобнымі партыйцамі, якія разпажыліся, на працягу доўгага часу цкавалі актыўную селькорку Мясьнікову, у выніку чаго давялі яе да вар'яцтва.

Здарэньне з Мясьніковай магло мець месца толькі выключна таму, што самакрытыка ў Межанскай арганізацыі ня была разгорнута.

Новыя факты праследваньня і цкаваньня рабкораў у Гомелі і іншых арганізацыях, выяўленыя ў сувязі з нядаўнім правядзеньнем Усебеларускага рабселькораўскага рэйду, абураючы факт з цкаваньнем селькоркі Мясьніковай гаворыць аб тым, што справа з разгортваньнем самакрытыкі ў радзе паасобных арганізацый усё яшчэ яўна нездавальняючэ.

Мы павінны павесьці бязьлітасную барацьбу з душыцелямі самакрытыкі. Мы павінны выпальваць усякія праявы цкаваньня, праследваньня рабселькораў, даючы кожнай праяве цкаваньня руйнуючы адпор, мабілізуючы ўвагу прапетарскай грамадзкасьці на барацьбе за яшчэ большае разгортваньне прапетарскай самакрытыкі.

Вось чаму мы павінны рашуча ўдарыць па апартуністых, у даным выпадку з межынскай арганізацыі, якія тармозяць далейшае разгортваньне самакрытыкі і гэтым самым садзейнічаюць барацьбе нашых клясавых ворагаў супроць дыктатуры прапетарыяту.

Прапетарскі суд павінен жорстка пакараць канкрэтных вінаватых у цкаваньні селькоркі Мясьніковай.

Справа селькоркі Мясьніковай

Вясковая актывістка селькорка Мясьнікова звар'яцела...

Кавалачак шпалераў, садраны са сьцяны, з напісанымі некалькімі словамі, не пакідаў ніякіх сумненьняў: рэдакцыя «Віцебскага Пралетара» атрымала гэты «ліст» ад Мясьніковай з псыхіятрычнай лячэбніцы.

Газэта забіла трывогу, зьмясьціла артыкул, патрабавала ўмяшальнасьці кантрольных органаў. ЦКК КП(б)Б выслала спэцыяльную камісію для расьсьледаваньня гэтае справы.

Грамадзкая і селькораўская дзейнасьць т. Мясьніковай

Тав. Мясьнікова, сялянка-бяднячка, прыехала ў Межынскі раён (вёска Пліткі, Рудзянскі сельсавет) у 1924 годзе. З гэтага часу яна прымае актыўны ўдзел у рабоце грамадзкіх арганізацый, выбіраецца членам сельсавету і прэзыдыуму, членам праўленьня малочнага т-ва, матыннага т-ва і раду іншых арганізацый (МОПР, бязбожнік). Адначасова яна таксама селькорствуе: піша заметкі ў «Віцебскі Пралетары», «Беларускую Вёску», «Работніцу і Сялянку» і цэнтральную «Крестьянскую газету». Заметкі яе носяць выкрываючы характар: барацьба супроць хутарызацыі, барацьба з хабарніцтвам, а надпольнымі абортамі, п'янствам і г. д.—вось тэмы заметак.

Пазьней тав. Мясьнікова, як актывістка, член Межынскага спажывецкага таварыства пасылаецца на курсы ў Менск і пасьля прыезду вылучаецца на пасаду загадчыка сталовай у Межах.

Кампанія хлусьні, як адказ на крытыку

Зразумела, што сярод антысавецкіх, кулацкіх элемэнтаў актыўная грамадзкая селькораўская дзейнасьць т. Мясьніковай выклікала вялікую злосьць і нянавісьць.

Яшчэ ў 1924 годзе, калі яна падала заметку для зьмяшчэньня ў насьценгазэту Рудзянскага сельсавету наконт п'янкі паасобных членаў камсамольскай ячэйкі — гэту заметку проста зьнішчылі. І ніхто іншы, як член рэдкалегіі Панфілаў—сын кулака. Гэта было зроблена пры яўным патуранні Якушэнка Кастуся, у той час—члена райкому камсамолу. Тав. Мясьнікова падала рад іншых заметак у насьценгазэту, але яны таксама ня былі зьмешчаны.

З пэкатарага часу, з нечай лёгкай рукі, у вёсцы пачынаюць пашыравацца чуткі: Мясьнікова, быццам, робіць таемныя аборты, вядзе распусное жыцьцё, захварала сіфілісам, Мясьнікова—спэкулянтка, самагонщыца і г. д. На падставе гэтых чутак зьмяшчаюцца заметкі ў насьценгазэту, Гэта-ж брыдкая хлусьня, нікім не праверяная, служыць матывам для адмаўленьня Мясьніковай у прыёме ў партыю. Тав. Мясьнікова аднак усё актыўна працуе, наведвае адкрытыя агульныя сходы ячэйкі і г. д.

У кампаніі цкаваньня селькоркі асабліва агідную ролю адыгрывае сакратар Рудзянскай ячэйкі **Якушэнка.** Калі ў 1929 годзе тав. Мясьнікова зноў падае заяву аб прыёме яе ў партыю, сакратар ячэйкі, які дагэтуль праследуе яе, урэшце абяцае прыняць яе ў партыю, прыставаючы пры гэтым да Мясьніковай, як да жанчыны. Аднак Мясьнікова ў партыю прынята ня была і праследаньне яе з боку Якушэнка працягвалася.

Калі Мясьнікова выкрыла кулака Селюкіна ў дачы хабару членам сельсавету, за што Селюкін быў прысуджаны да паўгода прымусовых работ, Якушэнка, які быў прыцягнуты ў якасьці сьведкі, імкнуўся замяць гэту справу і два разы на выклік суду не зьявіўся.

П'яніца і авантурысты Атрашкевічкуе селькорку

Калі Мясьнікова вярнулася з курсаў і была вылучана ў якасьці загадчыцы сталоўкі, старыя чуткі, што яна хворая на сіфіліс, вядзе распуснае жыцьцё—зноў пачалі распаўсюджвацца. Дае, на вялікі жаль пастакароў, мэдагляд (пры ўдзеле доктара венэраляга) устанавіў, што ўвесь пэрсанал сталовай, у тым ліку тав. Мясьнікова, здаровы.

Аднак сапраўдным праследвацелям Мясьніковай у Межах быў профработнік **Атрашкевіч.**

Атрашкевіч, шчыльна зьвязаны з клясава-чужым элемэнтам, якога выкрывала тав. Мясьнікова, арганізаваў супроць яе цэлы паход на ўсіх правілах вайсковага мастацтва. Ён на сны-нясцца перад складаньнем фальшывых дакумантаў, упятнае ў барацьбу паасобных партыйцаў раёну, рабочых сталоўкі і г. д. Атрашкевіч склікае вытворчыя нарады сталоўкі і скарыстоўгае іх для разьдзьмухоўваньня дробных памылак Мясьніковай з мэтай кампрамэтацыі і зьнішчэньня яе з работы.

У выніку ўсёй гэтай «работы», Межынскі прафсавет, па прапанове Атрашкевіча, вынес пастанову аб зьняцьці Мясьніковай з работы.

Але гэта яшчэ ня ўсё. Прыходзіцца толькі зьдзіўляцца нагласьці авантурніка Атрашкевіча і палітычнай блізарукасьці паасобных партыйцаў: Атрашкевіч выдае фальшывы дакумант работчаму вылучэнцу Зільбэргу, што ён пібыта дэлегат акруговай канфэрэнцыі нархарч, а таксама пісьцьку «шпаргалку» з «матар'ялам» для скампрамэтаваньня Мясьніковай на канфэрэнцыі. Зільбэрг, ня доўга думаючы, выступіў на акруговай канфэрэнцыі і добрасумленна вылажыў увесь хлусьлівы матар'ял на адрасе Мясьніковай.

Завяршэньне гэтай кампаніі цкаваньня адбылося на вытворчай нарадзе ад 7/IX г. г., дзе супроць Мясьніковай выступілі адзіным фронтам Атрашкевіч і рад партыйцаў, у тым ліку члены райкому.

Мясьнікова ня вытрымала. На гэтай нарадзе яна звар'яцела.

Раённае парткіраўніцтва справу Мясьніковай прамаргала

Як прызналіся парткіраўнікі на пасяджэньні ЦКК, яны гэту справу прамаргалі.

Як адносіўся Межынскі райком КП(б)Б да селькоркі Мясьніковай?

Бюро райкому ў пэрыяд з 1924-28 г. (пры сакратары тав. **Каралеве**) было вядома, што Мясьнікова зьяўляецца актывісткай-селькоркай. Калі яна зварачалася ў райком з прычынай ганеньня на яе з боку кулацкіх і антысавецкіх элемэнтаў, тав. Каралеў на заяве Мясьніковай не аказаў ёй ніякай садзейнасьці. Ранком, не праверыўшы хлусьлівых чутак з боку кулацкіх элемэнтаў, па гэтай падставе адмовіў Мясьніковай у прыёме ў партыю.

Пры сакратары тав. **Якаўлеве** (канец 1929 г. — палова 1930 г.) бюро райкому, маючы матар'ял аб запіску самакрытыкі ў Рудзянскай ячэйцы і ў прыватнасьці з боку былога сакратара ячэйкі **Якушэнкі,** ведаючы аб далейшых праследваньнях Мясьніковай — усё-ж ня ўжыло ніякіх рашучых мер для зьнішчэньня гэтых фактаў.

Склад райкому пры сакратары **Васільеве** (з мая 1930 г.), атрымаўшы даручэньне акругкому, урэшце заняўся справай Мясьніковай (у канцы ліпеня). Аднак, райком недаацаніў усёй сур'ёзнасьці справы.

***

Камісія ЦКК, якая выяжджала на месца для расьсьледваньня гэтае справы, устанавіла, што факты праследваньня і цкаваньня селькоркі Мясьніковай з боку раду работнікаў раёну—поўнасьцю пацьвердзіліся.

На прыкладзе камісіі парткалегія ЦКК прыняла пастанову, дзе дана палітычная ацэнка гэтай справы і вынесены парт. спагнаньні.

Пастанова будзе надрукавана ў адным з бліжэйшых нумароў нашай газэты.

М. ЗЯРНІЦКІ.

Чаму ўводзіцца дыфэрэнцыяваны пай

Вялізарныя задачы, якія стаяць зараз перад рабочай каапэрацыяй, у прыватнасьці перад МЦРК, патрабуюць вялікіх укладаньняў у капітальнае каапэрацыйнае будаўніцтва. Досьць адзначыць, што на працягу бліжэйшага году МЦРК павінен скончыць пабудову фабрыкі-кухні, пачаць пабудову другога буйнога механізаванага хлебазаводу, напырыць прыгарадныя гаспадаркі да 5.000 гэкт., пабудаваць аборы, сьвінарнікі, дамы для рабочых саўгасаў, набыць жывёлу, інвэнтар і г. д. Мы не гаворым ужо аб тым, што грамадзкае харчаваньне патрабуе значнага павялічэньня зваротных сродкаў.

Вось чаму каапэрацыя павінна ў бліжэйшы час мабілізаваць свае ўнутраныя рэсурсы, у першую чаргу паі. Нельга чакаць фінансавага падтрыманьня дзяржавы, бо дзяржаўныя сродкі павінны ісьці ў першую чаргу на справу індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Такім чынам, пастанова аб новых стаўках дыфэрэнцыяванага паю выклікана ростам і развіцьцём капітальнага будаўніцтва на лініі каапэрацыі.

Новыя стаўкі дыфэрэнцыяванага паю клясава-вытрыманы, яны ў пазначнай ступені закранаюць нізкаплачэнныя групы рабочых і служачых. Так, напрыклад, рабочыя з заработкам да 50 руб. замест 17 руб. 50 кап. будуць плаціць пай—19 руб., рабочыя з заработкам ад 51 да 100 руб.—замест 25 руб. 40 к.—30 руб. Паявыя ўносы інвалідаў вайны і працы, якія зарабляюць да 20 руб., не павялічваюцца. Для членаў сям'і пай устаноўлен у разьмеры ¼ асноўнага паю.

Для ўнясеньня паю ўстаноўлена досьць вялікая растэрміноўка—для найнічыкаў, якія нанава ўступаюць і плацяць 19 руб.—24 месяцы, для найнічыкаў, якія плацяць 30 руб.—20 месяцаў і г. д.

Плян пазнакапленьня за мінулыя месяцы выканан МЦРК толькі на 72 проц.

Зараз трэба ня толькі ліквідаваць гэты прарыў, але значна перавыканаць планы асобнага кварталу.

Работнікі ЦРК, каапактыў павінны неадкладна па-баявому ўзяцца за мабілізацыю паёў. Дагэтуль каапэрацыйныя камісіі, бюро і каапупаўноваженыя зусім слаба справіліся з гэтай задачай.

Асабліва адказная роля прыпадае на каапэрацыйнае бюро ў адносінах растлумачэньня рабочым прычын увядзеньня новага дыфэрэнцыяванага паю.

Пры належнай шырокай разгорнутай растлумачальнай рабоце, пры ўмове мабілізацыі каапактыву, плян збору дыфэрэнцыяванага паю і ліквідацыі запазычанасьці будзе выкананы.

ФЛЕЕР.

Пастанова СНК БССР

пра ўвядзеньне новага дыфэрэнцыяванага паю ў спажывецкай каапэрацыі

Для забесьпячэньня выкананьня фінансавага пляну спажывецкай каапэрацыі на квартал кастрычнік—сьнежань 1930 г. і на 1931 г., СНК БССР пастанаўляе:

1. Дазволіць Белкаапсаюзу ўстанавіць наступныя новыя стаўкі дыфэрэнцыяванага паю:

а) для рабочых, служачых і саматужнікаў ад 19 да 115 руб. з дыфэрэнцыяцыяй для асобных груп у залежнасьці ад разьмеру заработнай платы або даходу;

б) для сялян адзінаасобнікаў, якія ня плацяць сельска-гаспадарчага падатку, і для батракоў—15 руб.;

в) для сялян адзінаасобнікаў, якія плацяць сельска-гаспадарчы падатак—ад 32 да 150 руб., у залежнасьці ад даходнасьці гаспадаркі;

г) для сялян адзінаасобнікаў, якія абкладзены сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку і не пазбаўлены выбарчых праў,—120 р. пры даходнасьці гаспадаркі да 700 р. і 175 руб., калі даходнасьць гаспадаркі перавышае 700 руб.;

д) для асноўных найнічыкаў—членаў сельска-гаспадарчых камун—13 руб.;

е) для асноўных найнічыкаў—членаў сельска-гаспадарчых арцеляў — устанавіць дыфэрэнцыяваны пай у залежнасьці ад даходнасьці двара з 25 проц. сялян у параўнаньні з адзінаведнаю групаю індывідуальнага сэктару. Калі даходнасьць калгаснікаў не ўстаноўлена, дык пай устанаўліваецца з даходнасьці гаспадаркі да ўваходу гэтага найнічыка ў калгас;

ж) для студэнтаў пай устанавіць у наступным разьмеры: для студэнтаў-стыпэндыятаў, якія зарабляюць ад 21 руб. да 50 руб.—11 руб.; для студэнтаў, якія атрымліваюць стыпэндыю або зарабляюць ад 51 да 100 руб.—17 руб.; для студэнтаў, якія атрымліваюць стыпэндыю ў разьмеры больш за 100 руб.—25 руб.; студэнты, якія не атрымліваюць стыпэндыі і ня маюць самастойнага заработку каапэруюцца на агульных падставах, як усе іншыя члены сем'яў, што ня маюць самастойнага заработку (¼ паю асноўнага найнічыка);

з) для членаў сем'яў, якія ня маюць самастойнага заработку, устанавіць пай у разьмеры ¼ паю асноўнага найнічыка тае групы, да якое ён належыць;

і) для членаў сем'і, якія маюць самастойны заработак, устанавіць поўны пай у залежнасьці ад іх заработку або даходу.

2. Прапанаваць Белкаапсаюзу ўстанавіць раты для выплаты паявой заві-навачанасьці для кожнай сацыяльнай групы найнічыкаў, забясьпечыўшы больш доўгія тэрміны для груп рабочых, служачых, калгаснікаў, батракоў і беднаты, якія менш матар'яльна забясьпечаны, але з такім разьлікам, каб кантрольныя лічбы збору паёў на квартал кастрычнік—сьнежань 1930 г. і на 1931 г. былі выкананы.

3. Прапанаваць гарадзкім саветам, раённым выканаўчым камітэтам і сельскім саветам рабіць патрэбную дапамогу спажывецкай каапэрацыі пры правядзеньні растлумачальнай работы сярод найнічыкаў і ўвядзеньні новых ставак дыфэрэнцыяванага паю.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. ГАЛАДЗЕД.**
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Надзвычайнае Нарадны БССР **М. КАЛЕВІЧ.**
3 лістапада 1930 г.
г. Менск.

Паведамленьні

Сёньня, а 7 гадз. веч., у камвузе (каб. ленінізму) адбудзецца чарговае **пасяджэньне т-ва гісторыкаў - марксыстых.** У парадку дня: заключнае слова і прыняцьце рэзалюцыі па дакладу т. **Сорбэнты «Становішча на гістарычным фронце і нашы задачы».** 2. Арганізацыйныя пытаньні.

— **Кастрычніцкі РК КП(б)Б** даводзіць да ведама, што **канфэрэнцыя раённага таварыства садзейнасьці калектывізацыі сельскай гаспадаркі** адбудзецца 14 лістапада, у 6 гадз. веч. у клюбе Леніна (пас. вака.). Мандаты на канфэрэнцыю — атрымаць у РК 14 лістапада.

— **Кастрычніцкі райсавет Асоавіяхіму.** Курсы сакратароў вячэек Асоавіяхіму пачынаюць працаваць 14-XI у 7 г. веч. у памяшк. залі пасяджэньняў Вярх. суда (вул. К. Маркса, № 3). Заняткі будуць праводзіцца ў наступныя дні лістапада: 14, 17, 19, 21, 24, 27 і 29. Т. т., якія вылучаны на курсы, павінны зьявіцца на заняткі абавязкова і без спазьненьня.

СЁНЬНЯ:

— **Дом Камасьветы. У 7 гадз. веч.** — даклад для парт. і камсам. актыву на тэму: «Аграрная палітыка партыі». Пасьля — мастацкая частка. Білеты ў РК і ў чытальні дому.

— У 7 гадз. веч., пак. 21, — індывідуальная кансультацыя т. Аксельрода па палітэканоміі і эканомапалітыцы.

Адказны рэдактар **С. БУДЗІНСКІ.**

НЯНАВІСЬЦЬ

Дом Асьветы.
20 лістапада пачынаюць працаваць гурткі:
політкурсы па ленінізму, па палітэканоміі, па гісторыі, па рэвал. руху, бягучай палітыцы, політшкола для малапісьменных, політкурсы для дамкольніц, два вайсковыя гурткі, гурток беларускай мовы, гурток нямецкай мовы, шахм.-шаш. гурток, фэкульт. гурток, музычныя аркестры—духавы і струнны.
Дом Асьветы запрашае ўсіх асьветнікаў запісацца ў гурткі і курсы да 18 лістапада ўключна.
Запіс у канц. дому з 6 да 9 гадз. веч.

ДОМ АСЬВЕТЫ,
Сёньня, у 7 гадз. веч., адбудзецца
агульны сход асьветнікаў г. Менску
па пытаньні:
«Стан працы школ г. Менску (па матар'ялах манзўраў».

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
Сёньня, 14 лістапада, для пралетэтуду
ЗАКРЫТЫ ПАКАЗ
„ГОРАД ВЯТРОЎ"
Пачатак а 8 гадз. увеч.

Гукавое кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Кіно-тэатр „Культура"
КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
КІНО „Пралетары"
Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР"
КІНО „СпартаК"
1-я ГУКАВАЯ ПРАГРАМА
Вытворчасьці Беларджкіно
Пачатак сэансаў: 6 гадз., 7 г. 30 м., 9 гадз. і 10 гадз. 30 м.
Каса адчынена штодзенна ад 10 да 2 і ад 4 да 10 з пал. г. дз. увеч.
ВОГНЕННЫ РЭЙС
прыгодніцкі фільм у 6 частках
Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно № 5
Пачатак сэансаў дзённых: а 1 гадз. і 2 гадз. 30 м.
Увечары: 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м.
Каса адчынена з 12 гадз.
МЁРТВАЯ ДУША
Новы фільм у 6 частках
Пачатак сэансаў: 6 гадз., 7 г. 30 м., 9 гадз. і 10 гадз. 30 м.
Каса адчынена з 4 гадз. 30 м.
2 фільмы ў адзін сэанс
МАРАК — у 5 частках у галоўнай ролі ГАРОЛЬД ЛЕЙД
МАРАЛЬ — у 6 частках у галоўнай ролі ЭЛЕН РЫХТЭР
Пачатак сэансаў а 7 гадз.
— Каса адчынена з 5 гадз. —
Канец Санкт-Пецярбурга
у 7 частках
Пачатак 1 сэансу у 1 гадз., 2-гі—у 2-г. 30 м.
Каса адчынена з 12 гадз.
Замежны баявік у 2-х сэрыях
НІБЭЛУНГІ трагедыя у 12 частках
Дэманструецца 1-ая сэрыя.
Пачатак сэансаў: 1 с.—6 г. 2 с.—8 г. 30 м., 3 с.—11 г.
КАСА—з 5 г.

„ЗАПЖЕЛДОРСТРОЮ"
ПАТРАБУЮЦЦА:
ЭЛЕКТРАМЭХАНІКІ (наглядчыкі),
хто маюць добрую тэарытычную падрыхтоўку і практычны стаж на пабудове тэлеграфных ліній, тэлеграфных і тэлефонных станцый і хто ведаюць монтаж электравымяральных устаноўак;
старшыя тэлеграфныя рабочыя,
хто ведаюць работы па пабудове тэлеграфных ліній, устаноўцы і абслугоўваньні тэлефонных апаратаў, вопытныя ў кіраўніцтве рабочымі арцелямі па пабудове ліній сувязі;
тэлеграфістыя-марзістыя,
хто маюць вопыт работы на транспорце.
Заявы аб прыёме на службу з дакумантамі або вопытнай працоўнага сьпісу адрасаваць: Магілеў, БССР, вул. К. Маркса, 6.
Кіраўніцтва „Запжелдорстрою".

2-я раённая канфэрэнцыя МОПР'у
Кастрычніцкі раёну
адбудзецца 17 лістапада а 7 г. увеч.
у клюбе гарсавету.
Ячэйкам, якія ня выбралі далегатаў, неабходна зараз-жа выбраць делегатаў і сьпіс дасласьць у РК МОПР'у.
Мандаты выдаюцца РК ад 14 лістапада штодзенна з 10 да 12 і з 6 да 9 гадз. веч.
Делегаты-партыйцы павінны зьявіцца на пасяджэньне камфракцыі 17 лістапада ў клюб гарсавету а 5 з пал. гадз. увеч.
Кастрычніцкі РК МОПР'у

2-я Фрунзаўская раённая канфэрэнцыя МОПР'у
АДКРЫВАЕЦЦА
сёньня, 14 лістапада, аб гадз. увеч.
у клюбе будаўнікоў (вул. Энгельса, 13).
Мандаты можна яшчэ атрымаць у райкоме (Савецкая, 87) з 12 да 6 гадз. веч.
Камфракцыя адбудзецца а 5 гадз. увечары.
Просьба зьявіцца своячасова.
Фрунз. РК МОПР'у

ЦП саюзу саўгандальслужачых
паведамляе, што 15 лістапада а 7 гадз. увеч. у залі пасяджэньняў клюбу СГС склікаецца
нарада прафактыву
саюзу СГС г. Менску (старшыні МК і ГК, грамадзкія інструктары, брыгадзіры на праверцы калдагавароў і ўвесь актыў прафактыў).
У НАРАДКУ ДНЯ: 1) Даклад аб перазаключэньні новых калдагавароў (дакл. старш. ЦП т. Плятпеў). 2) Даклады МК, Дзяржпляну, БКО, ашчадкасы, ГК, ЦРК № 1 і 2 аб патрыхтоўцы да заключэньня новых калдагавароў.
Явка прафактыву абавязкова. Запрашаюцца ўсе члены саюзу.

ДА ВЕДАМА АГРАРНІКАЎ-МАРКСЫСТЫХ.
15-га лістапада а 7 гадз. увеч. партсэктар ЦО «ЗЬВЯЗДЫ» ў памяшканьні рэдакцыі
СКЛІКАЕ
НАРАДУ АГРАРНІКАЎ-МАРКСЫСТЫХ
на пытаньні
„Барацьба супроць буржуазнай тэорыі на аграрным фронце".
На нараду запрашаюцца ўсе члены таварыства аграрнікаў марксыстых.
Прысутнасьць т. т.: Пінчуна, Маргелава, Бондарава абавязкова.

ДА ЎВАГІ КАЛЕКТЫВАЎ І ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ!
СЭКТАР ДРУКУ БЕЛАРУСКАГА КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ
АБВЯШЧАЕ,
што ў мэтах зьнішчэньня скаргаў на неатрыманьне газэт, асабліва ў першыя дні падпіснога месяца,
КАНЧАТКОВА СПЫНЯЕ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ
З 27 ЧЫСЛА КОЖНАГА МЕСЯЦА.
Таму просім усіх уважаваных па друку прадпрыемстваў і ўстаноў, а таксама арганізатараў падпіскі ПРЫСТУПІЦЬ ДА ЗБОРУ ПАДПІСКІ ад работных і служачых свайго калектыву **не пазьней 14 XI.**
Сабраную падпіску **не затрымліваць, а здаць для выкананьня ў газэтнае бюро** (буд. пошты), або яго працаўніку, **пачынаючы з 15 XI.**
Адначасова звяртаем увагу ўважаваных і арганізатараў на правільнасьць адрасоў падпісчыкаў пры складаньні сьпісаў падпісчыкаў.
Трэба памятаць, што няправільны адрас выклікае непаразуменьні і скаргі на неатрыманьне газэт.
СЭКТАР ДРУКУ БЕЛАР. КІРАЎН. СУВЯЗІ.

МЯНЯЮ КВАТЭРУ з 3-х пакояў з усімі выгодамі ў Гомелі на кватэру ў Менску.
Круглы, 16, кв. 1, ТУРКІНА.

ЗОА-ВЫСТАУКА ЗЬВЯРЫНЕЦ
ДЗЯРЖЦЫРКУ Савецкая, 90, рог Ленінскай
адкрыта штодзенна з 8 г. ран. да 11 г. увеч.
ПРЫБЫЛІ НОВЫЯ ЗЬВЯРЫ:
леў, леапард, гіена паласатая, гіена плямістая, вауі, мядзьведзі, рысь, мураўеды, дзікабравы, барсукі, алень, эрблюд, арлы, крадзежы, 20 малп і шмат іншае зьвярыны.
Школам і экскурсіям—ільготная плата, скідка 40 проц.
АДМІНІСТРАЦЫЯ.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА
УСІМ!!! АДДЗЕЛ ПАДПІСНЫХ І ПЭРЫОДЫЧНЫХ ВЫДАНЬНЯЎ УСІМ!!!
ЧЫТАЙЦЕ І ПАДПІСВАЙЦЕСЯ! РАСПАУСЮДЖВАЙЦЕ!
АДЧЫНЕНА ПАДПІСКА НА 1931 Г. НА НАСТУПНЫЯ ВЫДАНЬНІ БДВ
24 нумары ілюстраванае двухтыднёвае часопісі „Чырвоная Беларусь" —часопіс высьвятляе ў мастацкім слове і ілюстрацыях рост і разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва СССР і БССР.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:	на год	на 6 мес	на 3 мес.	Асобны нумар
	3 руб.	1 р. 50 к.	75 к.	15 к.

12 кніг баявое часопісі—змагара за пралетарскую літаратуру „Маладняк" —орган беларускай асоцыяцыі пролетарскіх пісьменьнікаў.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:	на год	на 6 мес.	на 3 мес.	Асобны нумар
	5 р.	3 р.	1 р. 50 к.	50 к.

12 кніг часопісі „Полымя" —часопіс літаратуры, політыкі, эканомікі, гісторыі, крытыкі.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:	на год	на 6 мес.	на 3 мес.	Асобны нумар
	10 руб.	5 р. 50 к.	3 руб.	1 руб.

12 кніг часопісі „КОМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ" —часопіс педагагічнай, мэтадычнай і політычнай асьветы.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:	на год	на 6 мес.	на 3 мес.	Асобны нумар
	8 руб.	4 р. 50 к.	2 р. 30 к.	80 кап.

10 кніг часопісі „Узвышша" —часопіс літаратуры, мастацтва і крытыкі.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:	на год	на 6 мес.	на 3 мес.	Асобны нумар
	6 руб.	3 р. 50к.	2 р. 30 к.	80 кап.

Падпісацца можна: У аддзеле падпіскі БДВ—Менск, Савецкая, 79, ва ўсіх кіосках і магазынах БДВ, ва ўсіх паштовых аддзелах, упаўнаважаных БДВ і крамах спажывецкай кааперацыі.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
ДА „ДЭКАДЫ АБАРОНЫ" СССР
ВЫШЛІ з ДРУКУ і ёсьць у продажы ва ўсіх кнігарнях БДВ, Белкаапсаюзу і кніжных крамах спажывецкай каапэрацыі.

В. Калтыпін.—Барацьба за мір і Чырвоная армія.	Стар. 48.	Ц. 10 кап.
В. Унукаў.—Ці страшыць нас вайсковая тэхніка.	Стар. 60.	Ц. 12 кап.
З. Лясны.—Пра дні мінулыя.	Стар. 40.	Ц. 10 кап.
Э. Львоўскі.—Пад ботам легіёнаў Доўбар-Мусьніцкага.	Стар. 56.	Ц. 10 кап.
Весьнік.—У бойках за Кастрычнік.	Стар. 72.	Ц. 16 кап.
Стэрлін.—Чым насельніцтва дапаможа ў часе грамадзянскай вайны.	Стар. 40.	Ц. 10 кап.
Чупракоў.—Камсамол на дапрызыўнай падрыхтоўцы.	Стар. 42.	Ц. 10 кап.
Масквін.—Савецы ў барацьбе за мір.	Стар. 70.	Ц. 15 кап.
Паўлоўскі.—Як Чырвоная армія рыхтуе байца-грамадзяніна.	Стар. 32.	Ц. 6 кап.
А. Даўмін.—Наладжаньне ціру для стралковых гурткоў.	Стар. 50.	Ц. 15 кап.
Маліноўскі.—Жавчына і абарона.	Стар. 32.	Ц. 5 кап.
Ліноўскі.—Торгарыяльнік на вёсцы.	Стар. 32.	Ц. 8 кап.
Валоцкі.—Заводы і палеткі ў абароне.	Стар. 44.	Ц. 8 кап.
Чупракоў.—Абавязкі пераменнага складу тэрвойск у парыяд паміж зборамі.	Стар. 44.	Ц. 10 кап.
Давыдаў.—Што такое мабілізацыя.	Стар. 48.	Ц. 12 кап.
Буйоні.—Чырвоная армія на ўнутраным фронце.	Стар. 80.	Ц. 23 кап.
Какорын.—Абарона СССР і пяцігодка.	Стар. 48.	Ц. 15 кап.
Вяцоў і Лятухоў.—Чырвоная армія да XVI зьезду.	Стар. 48.	Ц. 10 кап.
Какорын.—Партактыў і задачы абароны СССР.	Стар. 100.	Ц. 45 кап.
Пінежскі.—Чырвоная гвардыя (пятарычны нарыс).	Стар. 144.	Ц. 40 кап.
Дзегцярэў.—Палітработа ў Чырвонай армі ў вайсковы час.	Стар. 240.	Ц. 1 р. 25 кап.
Фурманаў.—Фрунзэ.	Стар. 48.	Ц. 15 кап.
В. Леонцьеў.—Стралковы гурток і як яго наладзіць.	Стар. 48.	Ц. 10 кап.

ДРУКУЮЦЦА.
Костараў.—Мяжа на замку (пра АДУЧА)
Варашылаў.—Сталін і Чырвоная армія (2-е выданьне).
Бронін.—Ленін і Чырвоная армія (2-ое выд.)
Рабіновіч.—XVI зьезд УсеКП(б), абарона краіны і Чырвоная армія.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА" звяртацца па тэл. 2-49

Згубленыя і украдзеныя дакумэнты

пічыць несапраўднымі

Пасьведч. Дзямідовіча С. З., выд. Мен. с.-г. буд. спецкл., кв. 2870; чл. біл. саюзу хэмікаў Крэменчука М. М., кв. 2871. дапрыз. кн., выд. Самахвал. РВК, акладны ліст, страх. ліст, выд. Падгайск. с.-с. на імя Аляшкевіча К. І., кв. 2872-2873; кандыдацк. карт. № 38470 Лявіцкага Д. К., выд. Мен. АК КП(б)Б, кв. 2874; пасьведч. Шыціка У. І., выд. Астр.-Гарадз. кам. узаемадапам., кв. 2875; чл. біл. саюзу трансп., вайск. біл., выд. Мен. ваенкам. на імя Беланоўскага Г. К., кв. 2876-2877; каап. кн. т-ва «Зямляроб» Радлінскай Е. Б., кв. 2878; паляўн. біл., выд. Мен. саюзам паляўн., даведка аб працы, выд. 8 цагельн. Белдзяржбуду на імя Дубаневіча С. І., кв. 2879-2880; чл. біл. саюзу харчавікоў Колас Л. П., кв. 2881; час. пасьведч. Лешчык Л. Ф., выд. ДПУ, кв. 2882; камандн. пасьведч. Здаранкова М. Ф., выд. Вабр. паляводсэюзам, кв. 2883; чл. біл. саюзу гарбароў, даведка аб працы, выд. 1 п/к абутнікоў на імя Фрыдмана Р. Ш., кв. 2884-2885; вайск. біл., выд. кіеўск. ваенкам. чл. біл. саюзу камунальн. Крапіўніцкага А. Г., кв. 2886-2887; 12 тал. на прамтав. калгасу «Чыр. Партызан», выд. Самахвал. снаж. т-вам, кв. 2888; камсам. біл. № 5747 Шэйнкман Х. А., выд. Мазырск. АК ЛКСМБ, кв. 2889; папш. Мінкевіча Л. С., выд. Мен. міліцыяй, кв. 2890; чл. біл. саюзу швэйнікаў № 217432 Рубінштэйна Р. Л., кв. 2891; пасьведч. Нахумава С. Н., выд. Мен. ФЗН «Стройчэх», кв. 2892; метр. выш. Лібавай Р. Л., выд. Мен. ЗАГСам, кв. 2893; асаб. кн. Бялліна С., выд. Мен. страхкасай, кв. 2894; пасьведч. Кручкоўскай Х. А., выд. Астр.-Гарадз. міліцыяй, кв. 2895; камандн. пасьведч. Ноздрына А. Т., выд. Белсельтрастам, кв. 2896; каап. кн. т-ва «Зямляроб» Пяроўскага І. Р., кв. 2897; папш. Лодзінскай Р. К., выд.